Аліна Ваўранюк

# КОЛАЗВАРОТ

Падручнік па беларускай мове
для 4 класа
пачатковай школы

**KOŁAZWAROT**

Podręcznik do nauki języka białoruskiego
dla kl. 4 szkoły podstawowej

**Opracowała**
Alina Wawrzeniuk

**Okładka i zdjęcia**
Adam Pawłowski

**Ilustracje**
Mirosław Zdrajkowski, vecteezy.com

**Redaktor techniczny**
Adam Pawłowski

Podręcznik dopuszczony do użytku szkolnego przez ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania i wpisany do wykazu podręczników przeznaczonych do kształcenia ogólnego dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym do nauczania języka białoruskiego na poziomie klasy IV szkoły podstawowej na podstawie opinii rzeczoznawców dr Volhi Tratsiak i dr hab Radosława Kalety.
Numer ewidencyjny 1125/1/2021. Rok dopuszczenia 2021.
Podręcznik jest finansowany ze środków budżetu Ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania.

ISBN 978-83-934208-9-6

© Copyright by Stowarzyszenie „AB-BA”
Białystok 2021

**STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA”**
**15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8**
**www.ab-ba.com.pl**

**Wydanie pierwsze**

**Drukarnia**
Koncept Białystok

# Гэта твой новы падручнік па беларускай мове.

Тут дзесяць раздзелаў.
У кожным з іх розныя тэмы.
Яны падкажуць табе, чым будзеш займацца
на чарговых ўроках на працягу цэлага навучальнага года.

У «Колазвароце» шмат малюнкаў і здымкаў.
Многа вершаў, апавяданняў, казак, песень.
Спадзяюся, яны дапамогуць табе вучыцца і пазнаваць
прыгажосць
беларускай мовы і навакольнага свету.

Гэтая кніжка павінна служыць не толькі табе,
але і тваім малодшым сябрам.

## Таму шануй яе!



Не пішы ў ёй нічога, не рысуй.
Практыкаванні запісвай у сшытку.

Чытай, вучыся і памятай: кожнае, нават найбольш захапляльнае
падарожжа пачынаецца з самага блізкага:
простых слоў, звычайных рэчаў, сістэматычнай працы.

# Як карыстацца зместам?




## ЗМЕСТ

Тэмы ........ 5
За навуку, Якуб Колас ........ 6
Прывітанні, развітанні Алеся Літвіноўская, Глеб Лабадзенка ........ 7
Люда і людажэр, з часопіса «Гарбузік» ........ 8
Літары, гукі ........ 9
Дарога ў школу ........ 10
Клапатлівыя машыны, Алена Церашкова ........
Пра абавязкі, Васіль Жуковіч ........
Алфавіт ........
Выбары старасты, Мар'ян Дукса ........
Правапіс вялікай літары ........ 16
Верасень, Віктар Шалкевіч ........ 17

Тэмы ........ 18
Надвор'е, Алеся Літвіноўская, Глеб Лаба... ........ 19
Як людзі навучыліся есці бульбу, Валян... ........ 20
Рэцэпт на яблычны ўзвар ........ 21
Аканне ........ 22
Няма дома нашай мамы, Лар... ........ 23
Наша меню ........ 24
Смачна есці ........ 25
Род назоўнікаў ........ 26
Распарадак дня ........ 27
Смачны сон, Васіль Зуёнак ........ 29
Дзеяслоў ........ 30
Інтэрнэт, Рыгор Барадулін ........ 31
Тры чарапахі, Лявон Вольскі ........ 33

Тэмы ........ 34
Давайце пасадзім па дрэўцу, Хведар Гурыновіч ........ 35
Пасадзіце рабінку, Рыгор Ігнаценка ........ 37
Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя ........ 39
Буслы, Клаўдзія Каліна ........ 40
Правапіс „ў" (нескладовага) ........ 42

# Тэмы:

1. Нашы канікулы.
2. Прывітанні, развітанні.
3. Дазвольце адрэкамендавацца.
4. Літары, гукі.
5. Дарога ў школу.
6. Клапатлівыя машыны.
7. Нашы абавязкі.
8. Алфавіт.
9. Правапіс вялікай літары.
10. Песня «Верасень».





**Якуб Колас**

# За навуку

Заціхаюць гоні і даліны,
Павучкі наткалі павуціны

Ды развесілі на сонцы
Свае белыя красёнцы.

Кончыліся, дзеці, вашы гульні
Каля светлай рэчкі, каля пуні,

І на жоўценькім пясочку,
І ў зялёненькім лясочку.

Пахавайце вуды, стрэлы, лукі,
Прыступіце, дзеці, да навукі,

Каб было ўсё акуратна,
Каб вучыцца на “выдатна”.

Дык павучымся ж мы зімку шчыра;
Вясна вернецца, а з ёю – вырай,

Зноў мы слаўна пагуляем,
Свежых ягад назбіраем.

?

1. Дзе ты правёў / правяла свае канікулы?
2. Чым ты займаўся / займалася ўлетку?





# Вітаю Вас!
# Прывітанне! Здароў!
# Добры дзень!
# Добрае ночы!

**Як справы?** Цудоўна! Дзякую, паціху!
Так сабе...
**Як жывяце? Як маецеся?** Дзякуй, памаленьку, нядрэнна, добра, някепска...
**Як здароўечка?** Дзякую, нармалёва, добра, як трэба...
**А вы, ты як?** Дзякую, і я нічога сабе.
**А ў Вас як?** І ў мяне ўсё ў парадку.
**Да пабачэння! Пакуль! Шчасліва! Бывай!**
**Бывайце! Усяго добрага!**
**Да сустрэчы! Да вечара! Да заўтра!**
**Дабранач! Салодкіх сноў!**
**Пабачымся! Пачуемся! Стэлефануемся!**
**Спішамся!**

*«Мова нанова: 20 крокаў да беларускай мовы», Мінск 2016*




Жыла сабе дзяўчынка Люда.
Пайшла яна аднойчы на шпацыр.
Ідзе сабе, а насустрач ёй галодны людажэр.
Пабачыў ён Люду і ўзрадаваўся:
— Банжур, мадам! Дазвольце адрэкамендавацца – людажэр Вася. Прабач, але мне давядзецца цябе з’есці.
— А я людажэрка Люда, — не разгубілася дзяўчынка. – Таксама не супраць падсілкавацца.
Спалохаўся людажэр і кажа:
— Хіба ты не ведаеш, што Міністэрства аховы здароўя не рэкамендуе есці нямытых людажэраў? Што на нямытых людажэрах жывуць мільёны шкодных мікробаў? Давай я лепей хуценька збегаю памыюся, добра?
Схітрыць вырашыў.
— Добра, — кажа Люда. — Я таксама пайду памыю рукі. Сустракаемся праз дзесяць хвілін на гэтым жа месцы.
Ці варта казаць, што ніхто з іх на гэтае месца так і не вярнуўся?

*З часопіса „Гарбузік”*

?

1. Як цябе завуць?
2. Колькі табе гадоў?
3. Дзе ты жывеш?
4. У якой школе і ў якім класе ты вучышся?
5. Як маешся? Як справы?

# Літары бачу і пішу,
# Гукі ўсе чую і гавару.

Гукі на пісьме мы перадаем літарамі. Гукі мы вымаўляем і чуем, а літары пішам і бачым.

Для запісу гукаў беларускай мовы маем трыццаць чатыры літары.

Дзесяць літар абазначаюць галосныя гукі: **а, о, у, э, ы, і, я, е, ё, ю.**

Дзве літары абазначаюць нескладовыя гукі: **й, ў**.

Дваццаць адна літара абазначае зычныя гукі: **б, в, г, д, ж, з, й, к, л, м, н, п, р, с, т, ў, ф, х, ц, ч, ш**.

Гукі **дз** і **дж** абазначаюцца спалучэннямі дзвюх літар.

Літара **ь** (мяккі знак) змякчае зычныя літары.

Апостраф (ʼ) – надрадковы знак, які раздзяляе цвёрдыя зычныя.

**1.** Прачытай і скажы, колькі гукаў і колькі літар у кожным слове:

**дожджык, падʼезд, поўнач, колькі, здзьмухнуць, будзільнікі, тройка, мільён, васьмідзясяты**

**2.** У кожным слове замяні першы гук, каб атрымалася новае слова.

| | | | |
|---|---|---|---|
| **так – .....** | **мора – .....** | **касіць – .....** | **ліў – .....** |
| **горка – .....** | **карта – .....** | **каша – .....** | **мама – .....** |

**3.** Адгадай:

**З «т» – я кніга.**

**З «с» – я рыба.**

**З «л» – калолі мною лёд.**

**З «д» – жыве ўва мне народ.**



**1.** Дапоўні сказы:

Юрка ў школу хутка едзе на сваім .................. .

Да чакання я прывык, бо спазняецца ................. .

За ракою Віцеў дом. Завязе яго ................... .

Свой заплечнік забірай, завязе цябе ................ .

Нешта шэпча шына шыне. Еду ў школу на .............. .

Непатрэбны жарты, смешкі, бо я ў школу іду .............. .

**2.** Запішы, як ты дабіраешся ў школу.

аўтобус – на аўтобусе

трамвай – на трамваі

тралейбус – на тралейбусе

ровар / веласіпед – на ровары / на веласіпедзе

машына – на машыне

Алена Царашкова

# Клапатлівыя машыны

«Хуткім дапамогам»
Саступай дарогу!
Бел-чырвоная машына
Прывязе бінты і шыны,
Кропельніцы і шпрыцы,
Розныя таблеткі.
Зможа доктар памагчы
І бацькам, і дзеткам!



Лісты збірае тут і там
І ўсе адвозіць на паштамт,
Бо добрыя навіны
Хутчэй дайсці павінны!
З рыкам грузавік імчыць.
Што такое? Дом гарыць!
Да пажарнага гідранта
Цягне рукавы каманда,
Выраслі драбіны ў неба,
Тушыць полымя вада...
Жартаваць з агнём не трэба:
Можа здарыцца бяда.



Стала нашая машына.
Можа, больш няма бензіну?
Можа, рухавік зламаўся?
Тата моцна знерваваўся:

Ляпаў накрыўкай капота,
Злосна біў па колах ботам...
Не хвалюйся, любы тата!
Выклічам эвакуатар!

Ля кантэйнера, у скверы,
Завіхаўся смеццявоз.
«Лапай» скрыню ашчаперыў
І над кузавам патрос.



Сцепануўся, ушчыльніў –
І на сметнік парулiў.
Выкідайце, людцы, смецце,
Заўтра ён ізноў прыедзе!

На будоўлі ёсць машына:
Кузаў круціцца няспынна.
Едзе і бетон мяшае –
Вось руплівіца якая!



Калі добра размяшала –
Будзе дом стаяць трывала.
Калі ж будзе ленавацца –
Домік можа разламацца.

?

1. Чым займаюцца нашы памочніцы-машыны?
2. На якіх машынах ездзяць дактары, паштальён, пажарныя?
3. Якія з гэтых машын маюць права ехаць на чырвонае святло?
4. Навошта трэба ведаць правілы дарожнага руху?
5. Як ты паводзішся на дарозе?

# Трэба!

Васіль Жуковіч

## Пра абавязкі

Ёсць такое слова: «Трэба!»
Людзі з імраслі заўжды.
Без яго – ну як без хлеба,
Без паветра, без вады.
Як дыханне – слова гэта,
Без яго як жыў бы свет?
Трэба – гэта крок да мэты,
Трэба – гэта запавет.
Трэба сеяць і ахоўваць,
Здабываць і будаваць,
Шанаваць, расціць, выхоўваць,
Пра сваю краіну дбаць.
Час імчыцца! Час імчыцца!
Ад яго не адставай:
Змалку ты любі вучыцца,
Змалку веды здабывай!...

?

1. Як разумееш слова «трэба»?
2. З якімі іншымі словамі яно табе асацыюецца?
3. Якія ў цябе абавязкі?




Усе літары, размешчаныя ў пэўным парадку, называюцца

# алфавітам

Кожная літара ў алфавіце мае сваю назву.

| Аа | Бб | Вв | Гг | Дд | Дждж | Дздз | Ее | Ёё | Жж | Зз | Іі | й |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | бэ | вэ | гэ | дэ | джэ | дзэ | е | ё | жэ | зэ | і | і нескладовае |

| Кк | Лл | Мм | Нн | Оо | Пп | Рр | Сс | Тт | Уу | ў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ка | эл | эм | эн | о | пэ | эр | эс | тэ | у | у нескладовае |

| Фф | Хх | Цц | Чч | Шш | ы | ь | Ээ | Юю | Яя |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| эф | ха | цэ | чэ | ша | ы | | э | ю | я |

1. Паразважай, навошта трэба памятаць парадак літар у алфавіце.
2. Запішы імёны сваіх аднакласнікаў у алфавітным парадку.
3. Запішы словы ў алфавітным парадку. Пры гэтым вазьмі пад увагу першую, другую і трэцюю літары:

**яма, саліла, драмаць, дрэнны, фатаграфія, зорка, шахматы, чарнявы, ліфт, душ, чорны, жнівень, урокі, альбом, будзільнік, адпачывалі, другі, жабы, хадзіў, белыя, дваццаты, прыгожая, доўгі.**

**Мар'ян Дукса**

# Выбары старасты



Хто галоўным будзе нашым?
Хто найлепшы з нас усё ж?
Можа, Воля, можа, Саша —
хто з іх самы-самы?.. Хто ж?
Наша ўлада, наша воля —
выбраць старасту сабе.
Але надта ж крыкса Воля,
Саша – стукне па ілбе...
І за іх не горшы Лёнік.
Вось нядаўна выйграў крос,
піша ўсе заданні ў дзённік,
задзірае рэдка нос.
Самы сціплы хто з нас сёння —
задаецца хто ледзь-ледзь?
Хоць нашто ён нам – ціхоня?
Будзе толькі чырванець...
Да ўсяго, напэўна, здатны
весялун найбольшы – Клім.
Рослы, бойкі, акуратны,
але трохі падхалім.
— Лёня хай! Спартсмен-разраднік...
Што спрачаецеся вы!
Хай сабе і не выдатнік —
абы хлопец дзелавы!



?

1. Каго выбіралі вучні?
2. Якія былі кандыдаты?
3. Што можаш сказаць пра Волю, Сашу, Лёніка, Кліма?
4. Назаві рысы характару добрага старасты.
5. Запішы імёны ўсіх дзяцей з верша з падзелам на склады.

**Уласныя імёны (імёны і прозвішчы людзей, клічкі жывёл, геаграфічныя назвы, назвы літаратурных і музычных твораў, газет і часопісаў) пішуцца з вялікай літары.**

**1.** Запішы імя і прозвішча свайго сябра і сваёй сяброўкі.

**2.** Дапоўні сказы імёнамі дзяцей.

... добрая вучаніца.
... ужо чацвёртакласнік.
... вучыцца на выдатна.
... і ... добрыя сябры.
... з ... сядзяць за адной партай.

**3.** Растлумач ужыванне вялікай літары.

Беласточчына, Афрыка, Маліннікі, кошка Мурка, Міра Лукша, месячнік «Часопіс», Татры, вуліца Кастуся Каліноўскага, Вісла, верш «Караблік» Віктара Шведа, Сакрат Яновіч

**4.** Складзі сказы са словамі:

Беласток, Ніна, Нарва, газета «Ніва», Міхась, Беласточчына, Кананюк, Еўропа, Пякарская.

**Віктар Шалкевіч**

# Верасень

Верасень, слотная пара.
Дождж ідзе бесперастанку.
Эх, прыбіцца б нанач да двара,
Дзвярэй не адчыняць, не бяда,
Пераспім на ганку.

Не касі вухам коню шэры.
Пачакай, праз поўвярсты,
Замігціць агеньчык залаты.
Будзе вёска, а ў вёсцы вячэра,
Адпачнеш нарэшце ты.

Можа ў вашай хаце, гаспадар,
Вольны знойдзецца куточак.
Хіба нас, пане гаспадар,
Хіба нас, добры гаспадар,
Нанач з хаты гнаць не схочаш.

Верасень, слотная пара.
Дождж ідзе бесперастанку.
Эх, прыбіцца б нанач да двара,
Дзвярэй не адчыняць, не бяда,
Пераспім на ганку.



*Вярста – старадаўняя мера адлегласці, вядомая з XI ст. Яна раўнялася каля 1067 м.*

# Тэмы:

1. Надвор’е.
2. Здаровае харчаванне – агародніна і садавіна.
3. Аканне.
4. Наша меню. Рэцэпт.
5. Смачна есці.
6. Час. Вызначаем гадзіну.
7. Род назоўнікаў.
8. Распарадак дня.
9. Свабодны час.
10. Песня «Тры чарапахі».

# Надвор’е



**Пагода –** добрае надвор’е.
**Сонца (сонейка) –** пячэ, шкварыць, прыпякае, награвае паветра.
Летняя спёка, гарачыня.
Асенняя лагода.
Зімовая сцюжа.
Веснавая (вясновая, вясенняя) свежасць.





**Ападкі:** дождж, залева, град, снег.

**Ясна, сонечна, горача, цёпла, хмурна (пахмурна, хмарна), холадна (халодна, халаднавата), прахалодна, воблачна.**



**Бярэцца (паказвае) на дождж, на мароз.**

**Задажджыць, заснежыць, заімжыць.**

**Навальніца (бура), гром (грымоты), маланка (бліскавіца, пярун), вясёлка. Маланка бліскае.**

**Вецер (ветрык, вятрыска)** паўночны, усходні, заходні, паўднёвы, слабы, моцны, парывісты. **Вецер вее (дзьме)**.

**Непагадзь (непагода) –** дрэннае надвор’е. **Слота (слата) –** мокрае надвор’е **(дажджлівае надвор’е)**.





# Як людзі навучыліся есці бульбу



Можа вы не ведаеце, што бульба, якую мы цяпер ямо штодзень, пару соцень год таму была зусім невядомай у нас раслінай. А калі бульбу пачалі прывозіць з-за мора, з Амерыкі, то яна была такая дарагая, што мала хто мог яе купіць.

Аднаго разу здарылася, што багаты пан купіў гэтае заморскае дзіва і загадаў агародніку пасадзіць яго старанна ў пульхную зямлю.

І вось вырасла зялёная сцяблінка, а на ёй неўзабаве зацвіў прыгожы белы цвет.

– Калі гэты цвет звяне, – падумаў сабе агароднік, – тады, напэўна, з’явяцца прыгожанькія плады.

Так яно і было. Паміж лісточкамі на жаўтаватым сцябле выраслі зялёныя цвёрдыя шарыкі. Яны былі велічынёю як арэх, а пад скуркай у іх было насенне.

– О, якія прыгожыя, – усцешыўся агароднік, – вось жа будзе смачная страва.

Ён сарваў зялёныя арэшкі, а кухар зварыў іх, паліў алеем і багата пасыпаў цукрам. Запрасілі гасцей на банкет, але нагатаваная ежа была горкая, цвёрдая, і ніхто не хацеў яе есці.

Узлаваўся пан, загадаў развесці вялікі агонь, вырваць расліну з карэннем і знішчыць яе раз назаўсёды. Але што за чары! Калі вогнішча астыла, знайшлі ў попеле бурыя клубні, мяккія і смачныя.

– Ага, я ўжо ведаю! – сказаў агароднік, – гэта не вяршкі трэба есці, толькі клубні.

Цяпер ніхто ўжо, напэўна, не памыліцца і не зварыць суп з маленькіх зялёных плодзікаў бульбы.

паводле Валянціны Пашкевіч

?

1. Адкуль з’явілася ў нас бульба?
2. Якую памылку зрабіў агароднік?
3. Якой аказалася новая страва?
4. Што загадаў пан?
5. Якую частку бульбы трэба есці?
6. Якія стравы робяць з бульбы?

**Кожны чалавек павінен памятаць пра здаровае харчаванне. Дзеля таго трэба ўжываць карысную і разнастайную ежу (прадукты). Агародніну і садавіну трэба есці як найчасцей, а салодкае радзей.**



## Рэцэпт на яблычны ўзвар

**Інгрэдыенты:** яблыкі – 500 грам,
цукар – 4 сталовыя лыжкі,
вада – 2 літры.

Яблыкі парэзаць на долькі, ваду паставіць на агонь і давесці да кіпення. Дадаць яблыкі і цукар. Зноў давесці да кіпення, выключыць агонь і пакінуць на 20 хвілін.

У беларускай мове гукі **о**, **э** пад націскам вымаўляюцца выразна.
У ненаціскных складах **о**, **э** пераходзяць у **а**.

Такі пераход называем **аканнем**.

**дом – дамы**
**соль – саліць**
**ногі – нага**
**шэсць – шасцёра**
**цэнны – цаніць**

**1.** Змяні словы так, каб галосныя **о**, **э** сталі не пад націскам:

**голас, мора, цэгла, холад, ход, жоўты, позна, нос, восень, рэдкі, зорка, сок, бок, доўгі, поўная, боль, поўнач, поўдзень.**

**2.** Перакладзі словы на польскую мову. Параўнай правапіс у беларускай і польскай мовах:

**агарод, агурок, акуляры, акно, асцярожна, абысці, паказаць, расці, салідны, вакол, нага, цаніць, цагляны, драўляны, далікатны, павесіць, малітва, камплект, каза, падвойны, пазіцыя, параўнай.**

**3.** Прачытай. Падумай, якія літары трэба ўставіць замест кропак.

**Уч...ра ц...лы дзень і ўсю ноч ішоў пр...ліўны дождж. С...нца не вых... дзіл... з-за хм...р. У лесе сярод м...л...дых др...ў выр...сл... шмат грыб...ў. П...йдзем у лес і н...збіраем п...ўныя к...шыкі б...р...вікоў.**

**Ларыса Генiюш**

# Няма дома нашай мамы...



Няма дома нашай мамы,
Гаспадарыць сёння Маня,
Хоча ўсіх нас накарміць,
Будзе боршч сама варыць.
Палажыла кусок мяса,
Наліла вады і квасу,
Туды бульбы і капусты
І фасолі густа, густа.
Буракоў і жменю солі,
Лісту, перцу як найболей.
Вось абед ужо гатовы.
Боршч, здаецца, адмысловы.
Тата кажа: «Многа солі».
Мама кажа: «Мне даволі».
А брат Славік : «Мне здаецца,
Тут замнога перцу».
Калі Маня гатавала,
Есці нас усё змушала:
«Тут адныя вітаміны
І вы з’есці ўсё павінны.
Трэба ж слухацца нарэшце
Вельмі смачна – ежце, ежце!»

?

1. Якой гароднінай карысталася Маня, калі варыла суп?
2. Запішы рэцэпт на боршч Мані.

# Наша меню



## Што ямо на снеданне?





бутэрброд

рагалік з маслам

філіжанка какавы

## Што ямо на абед?









смажаная бульба
(каша, рыс)
і катлетка

шклянка кампоту

салата

суп



кубак малака

## Выберы, што будзеш есці на падвячорак.







пячэнне

ёгурт

сыр



гарбата

## Што з'ямо на вячэру?



груша



яблык



джэм



луста хлеба



кефір



памідор



вяндліна

# Смачна есці



1. Запішы сваё прыкладнае меню на ўвесь дзень.
2. Разгледзь малюнкі.
3. Адкажы на пытанні:

**У колькі гадзін снедаюць?**
**Калі абедаюць?**
**А каторай гадзіне вячэраюць?**

4. Запішы сказы:

**Я снедаю ў ...... гадзін.**
**Я ем абед у ...... гадзін.**
**Я вячэраю а ...... гадзіне.**







# Спытай у мяне, ХТО ці ШТО гэта – і дам я назвы людзям і прадметам.

**Большасць назоўнікаў належыць да аднаго з трох родаў: мужчынскага, жаночага або ніякага.**

**Да мужчынскага роду адносім назоўнікі, да якіх можна дадаць словы мой або гэты: мой стол, мой кубак, гэты нож.**

**Да жаночага роду адносім назоўнікі, да якіх можна дадаць словы мая або гэта(я): мая талерка, мая міска, гэта(я) лыжка.**

**Да ніякага роду адносім назоўнікі, да якіх можна дадаць словы маё або гэта(е): маё крэсла, маё кацянё, гэта(е) поле.**

**1.** Вызначы род назоўнікаў: кухня, зерне, суп, паліто, агарод, агурок, страва, пятрушка, абрус, табурэтка, люстра, фасоля, гарох, соль, перац, цукар, кампот, збожжа, сняданак, вячэра, ежа, адзенне.

**2.** Запішы па тры назоўнікі мужчынскага, жаночага і ніякага роду.



кубак



лыжка

глыбокая талерка





плыткая талерка



відэлец



нож



сподак

# Распарадак дня

Карыстаючыся рысункамі раскажы, як ты праводзіш дзень.



прачынаюся



мыюся



апранаюся



снедаю



іду ў школу



вучуся



рыхтую ўрокі



абедаю



гуляю



гляджу тэлевізар



вячэраю



чытаю



бяру душ



іду спаць

**Васіль Зуёнак**

# Смачны сон

Сніўся Пецю смачны сон:
На батоне ехаў ён.

Лётаў Сцёпка на бліне,
Як на цуда-дыване.

Цыркачом Сымон на ганку
Прыкаціў на абаранку.

Кліма ўзняў аж на аблок
Дырыжабль-агурок.

Паддаваў Мікіта пары:
Бег цягнік за самаварам.
Як вагоны – булкі-плюшкі,
А замест білетаў – сушкі.

Ды галодны бег Дзяніс –
Паўбатона ўміг адгрыз.

А пасля – зблажэў зусім:
Абаранак раскусіў.
А ў дадатак, на закуску,
Агурком Дзяніс захрускаў.

Да бліна не дацягнуўся,
Блін у рукі сам вярнуўся:
Апусціўся, бо дачасна
У ім без масла
Цяга згасла.

І гарбаты не папіў,
Бо Мікіта затрубіў.

Тут і Пеця прахапіўся,
Смачны сон перапыніўся.



1. Чаму верш мае загаловак «Смачны сон»?
2. Якія настрой верша? Чаму?

?

**3.** Упішы прапушчаныя словы.

Пецю ................ сон. Ён ................ на машыне.
Сцёпка ................ на бліне.
Сымон ................ на абаранку.
Кліма ................ агурок.
Цягнік ................ за самаварам.
Дзяніс ................ паўбатона і ................ абаранак.
Мікіта ................ .

**4.** Спішы. Устаў словы, якія абазначаюць назвы дзеянняў.

Мама ...... ежу. Тата ...... посуд. Ася ...... падлогу. Коля ...... абутак. Дзядуля ...... газету. Бабуля ...... кветкі. Настаўніца ...... урок.

**5.** Адкажы, хто або што выконвае гэтыя дзеянні?

| | | |
|---|---|---|
| Ідзе ...... . | Ляціць ...... . | Бяжыць ...... . |
| Скача ...... . | Коціцца ...... . | Ляжыць ...... . |
| Плавае ...... . | Едзе ...... . | Шуміць ...... . |

**6.** Змяні словы так, каб яны абазначалі дзеянні. Запішы.

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| пісьмо | – | пісаць | чырвоны | – | чырванее |
| абед | – | ...... | хворы | – | ...... |
| сябар | – | ...... | цёмны | – | ...... |
| корм | – | ...... | вечар | – | ...... |

**7.** Прачытай сказы. Замест кропак устаў адпаведныя дзеясловы.

Кася (што рабіла?) ...... цікавую кніжку пра звяроў.
Славік (што зрабіў?) ...... цікавую кніжку пра звяроў.
Данік і Якуб (што робяць?) ...... па калідоры.
Ася і Зойка (што рабілі?) ...... Бартку карціну.
Хлопцы (што будуць рабіць?) ...... вясёлыя песні.
Дзяўчаткі (што зробяць?) ...... у горы.
Дзеці (што зрабілі?) ...... у сваім пакоі.

### Рыгор Барадулін

# Інтэрнэт

Ёсць павук нябачны, быццам сон.
Павуцінаю няўлоўнай ён

Абвівае шар зямны з імпэтам.
Той павук завецца інтэрнэтам.

Што было, што ёсць,
Што будзе ў свеце –
Звесткі ёсць пра ўсё ў інтэрнэце.

З дому не выходзячы нікуды,
Можаш слухаць птушак, буццам цуды.

Ні пяра не трэба, ні паперы
Сябру ліст прыслаць. Нячутна ў дзверы

Грукнецца нябачны паштальён,
Ліст у той жа міг уручыць ён.

Слухай інтэрнэт, чытай, пішы –
Але й сам мазгамі варушы.








?

1. Адкажы, як табе ў жыцці дапамагае інтэрнэт?
2. Колькі часу ты праводзіш за камп'ютарам?
3. Як разумееш два апошнія радкі верша?



слімак



мыш



бяздротавая мыш



клавіятура



тэчка (каталог)



прынтар (друкарка)

4. Што можаш рабіць?

- **набіраць, друкаваць ліст,**
- **раздрукаваць тэкст,**
- **спампаваць, сцягваць інфармацыю,**
- **адказаць на электронны ліст,**
- **закінуць у тэчку цікавыя здымкі,**
- **гуляць у камп'ютарныя гульні.**

Вывучы словы песні

**Лявон Вольскі**

# Тры чарапахі

**Калі раптам адчуеш камунальныя пахі**
**І жыццё цябе возьме ў пятлю,**
**Зразумееш тады, што тры чарапахі**
**Па ранейшаму цягнуць Зямлю.**
**Калі выйдзеш у горад, ці залезеш у горы,**
**І з людзьмі ўсталюеш кантакт,**
**Зразумееш тады, што і сёння і ўчора**
**Наша месца на трох кітах.**

Прыпеў:
**Гэй, ла-ла-ла-лай, ты не чакай, сюрпрызаў не будзе.**
**Гэй, ла-ла-ла-лай, ты не чакай, ты не чакай.**

**Не было Галілея і Боба Марлея,**
**Не было Сальвадора Далі.**
**Ні Леніна, ні Ленана, ні Карла Лінэя,**
**А кіты, чарапахі былі.**

Прыпеў: **Гэй, ла-ла-ла-лай...**

**Каб любіць Беларусь, нашу мілую Маму,**
**Трэба ў розных краях пабываць!**
**Зразумееш тады – пад тваімі нагамі**
**Тры сланы нерухома стаяць.**

Прыпеў:
**Гэй, ла-ла-ла-лай, ты не чакай, чаканне дастала.**
**Гэй, ла-ла-ла-лай, ты не чакай, ты не чакай!**

## Тэмы:

1. Дрэвы вакол нас.
2. Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя.
3. Птушкі.
4. Правапіс **ў** (нескладовага).
5. Свойская жывёла.
6. Белавежскія зубры.
7. Звонкія і глухія зычныя.
8. Фатаграфія.
9. Шануй усё жывое.
10. Песня «Лось з Ласінкі».

Хведар Гурыновіч

# Давайце пасадзім па дрэўцу

Давайце, юныя сябры,
Па дрэўцу восенню пасадзім
Ля кожнай лавачкі ў двары
І паўз сцяжынкі ў школьным садзе.

Рабіны, ліпкі і кляны –
У скверы, ў парку, на алейцы.
Хай толькі прымуцца яны,
Маленькія перасяленцы.

Падсыплем мяккае зямлі
Пад кожны саджанец рыдлёўкай.
Яны ў глушы лясной раслі,
Прывыкнуць будзе ім нялёгка.



Калі ж на месцейка сваё
Карэньчык кожны ў ямцы ляжа,
Калочкі вострыя заб'ём
І камялькі да іх прывяжам.

Таполю возьмем, дуб, каштан,
Ім месца знойдзецца ўсім тут.
Агорне іх густы туман,
А ранкам дождж палье праз сіта.

Пасля зямелька ўся засне
Сном непарушным і вялікім,
І рукавічкі белы снег
Надзене дрэўцам на галінкі.

Як зазвоняць ручайкі
І траўка першая праб'ецца,
Мы паімчымся нацянькі
Усім дваром да нашых дрэўцаў.

Тут так прыгожа, слаўна так
У вершалінах свішчуць птушкі,
Салоўка ў маі, летам – шпак,
Зімой – снягір ці амялушка.

Няхай і паркі, і сады
Шумяць зялёным чуйным веццем...
Той, хто хоць дрэўца пасадзіў, –
Невыпадкова жыў на свеце.



?

1. Да чаго заахвочвае аўтар верша? Чаму варта гэта зрабіць?
2. Адшукай у вершы назвы дрэў. Запішы іх у алфавітным парадку.
3. Якія дрэвы растуць побач твайго дома?
4. Адшукай у вершы назвы птушак. Запішы іх з падзелам на склады.

# Пасадзіце рабінку

Той чалавек, які не пасадзіў ніводнага дрэўца, дарэмна жыццё пражыў. Так вучыць мудрая народная прымаўка.

Але чаму я раю пасадзіць рабінку, а не бярозку альбо клёнік ці ліпку?

Можна, вядома, і іншыя дрэўцы пасадзіць. У мяне, напрыклад, ёсць каля дома і бярозка, і елачка, і асінка.

Дык вось паслухайце, чаму я раю менавіта рабінку пасадзіць.

Вясною гэта дрэўца адно з першых распускаецца. Наўкол яшчэ шмат якія дрэвы голыя стаяць, а яно ўжо тонкімі карункамі каля дома зелянее.

А як прыгожа цвіце рабіна! Па зялёнай кроне белымі шапкамі раскіданы пышныя суквецці. Прыемны водар ад іх на вярсту чуцен.

У канцы лета, калі ўсё ў прыродзе пачынае блякнуць і губляць сваю пышную прыгажосць, раптам пад акном успыхне рабіна. Загарыцца чырванню полымя і прамяніцца не згасаючы. І вось часам спыніцца які-небудзь прахожы і падзівіцца:

Хараство якое!

Восенню каля вашага дома ўвесь час будуць трымацца розныя птушкі – шпакі, дразды, снегіры. На дрэўцы яны будуць ласавацца сакавітымі ягадамі, дзякаваць звонкімі галасамі гаспадару за смачны пачастунак.

Калі лісце на дрэвах ападзе, на рабінцы доўга яшчэ будуць чырванець гронкі ягад, звычайна аж да самага снегу.

Не здзіўляйцеся, калі да вас завітаюць стары дзядок або бабулька, якія ўжо не могуць схадзіць далёка ў лес. Яны папросяць ягад на лекі.

Пасадзіце, дзеці, сабе рабінку, не пашкадуеце. А як гэта лепей зрабіць, думаю, вам кожны дарослы дапаможа.

Рыгор Ігнаценка



1. Як разумееш сэнс народнай прымаўкі ў пачатку апавядання?
2. Чаму пісьменнік раіць пасадзіць менавіта рабінку, а не іншае дрэўца?
3. Знайдзі і прачытай сказы, якія апісваюць рабінку.
4. Як выкарыстоўваюць ягады рабіны?

# Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя

**1.** Прачытай уголас прыведзеныя ніжэй словы. Звярні ўвагу на розніцу ў вымаўленні выдзеленых зычных:

**б**эз – **б**егаў, **в**ыхад – **в**іхор, **г**орад – **г**ерой, **з**аехаў – **з**імовы, **к**от – **к**іно, **л**ысы – **л**іса, **м**ыла – **м**ілы, кі**н**о – восе**нь**, **п**усты – а**п**енькі, **с**ын – **с**іні, **ф**ота – а**ф**іцэр, **х**олад – **х**ітры, **ц**ыбуля – у**ц**якай.

Вымаўленне большасці зычных гукаў бывае і цвёрдым, і мяккім. На пісьме яны абазначаюцца тымі ж самымі літарамі. Мяккасць зычных на пісьме перадаецца галоснымі **і**, **е**, **ё**, **ю**, **я** і мяккім знакам (**ь**).
Толькі **д** пераходзіць у **дз** (**д**ва – **дз**ве, лё**д** – лё**дз**е, го**д** – го**дз**е), а **т** пераходзіць у **ц** (лё**т**аць – паля**ц**еў, пло**т** – на пло**ц**е, ха**т**а – у ха**ц**е).
Зычныя **ж**, **дж**, **ч**, **ш**, **р** ніколі мяккімі не бываюць, таму называем іх **зацвярдзелымі**.

**2.** Замяні выдзеленыя мяккія зычныя цвёрдымі, каб атрымалася новае слова:

**в**язі – **в**азі, **н**ясі – ....., **с**ені – ....., **в**яжу – ....., **м**ех – ....., **л**ясы – ....., **с**яду – ....., **в**ёску – ....., **м**ёду – ....., **с**ценкі – ....., **м**яса – ..... .

**3.** Прачытай сказы. Спішы сказы і ўпішы мяккі знак.

**Вол...га пачала чытац... кніжку пра гісторыю Грузіі.**
**Кол...кі гадоў ляжыц... тут гэты камен... ?**
**Кожны дзен... да нас прыбягаў кон... .**
**Ваз...мі рэдз...ку і пакладзі яе на стол.**
**Мая сястра ў вос...мым класе.**

**4.** Складзі сказы са словамі: жыццё, хаджу, чужы, шырокі, рыс, меншы, жоўты.

## Буслы (Казка)

Здарылася гэта яшчэ ў той час, калі буслы ў наш край рэдка прыляталі і ногі ў іх тады былі не чырвоныя, як цяпер, а белыя.

Аднаго разу вясной прыляцелі яны ў нашу пушчу і селі на сухую верхавіну высокай сасны, што расла на ўзлессі.

– Вось тут і зробім сабе гняздо, – сказаў бусел. – Тут рэчка блізка, балота побач, вужоў і жаб многа, будзе нам і нашым дзецям спажывы даволі.

І пачалі буслы насіць на дрэва сухое ламачча, мох, сталі будаваць сабе дамоўку.

А трэба сказаць, што вясна таго году была няўдалая: то сонца прыпячэ, то снег пойдзе, то мароз ударыць.

Прачнуліся аднойчы бусел з бусліхай на досвітку, а вакол усё снегам пакрыта. Паляцелі яны на балота, хацелі спажыву сабе здабыць, але нічога не знайшлі. Усё замерзла, заледзянела. Памарозілі буслы свае босыя ногі і вярнуліся назад.

А тут новая бяда! Вецер разбурыў і раскідаў гняздо.

Селі птушкі на сасне і зажурыліся.

– Што ж мы з табой будзем рабіць? – загаласіла бусліха.

– Давядзецца памерці з голаду і холаду...

Падумаў, падумаў бусел і так загадаў буслісе:

– Не плач, сяброўка дарагая, давай паляцім да людзей. Можа яны нас пусцяць пагрэцца. Бачыш, вунь, на ўзлессі, хата стаіць. Давай папросімся туды.

А ў той старэнькай хатцы жылі ўдваіх душою дзед і баба. Ніякае гаспадаркі ў іх не было, адна старая сівая авечка. Баба прала з воўны ніткі, рабіла панчохі добрым людзям. А дзед лавіў рыбу. Так яны і жылі.

Тае раніцы дзед з бабай якраз былі ў хаце. Чуюць:

– Тук, тук, тук! - пастукаўся нехта ў дзверы.

– Пайдзі, дзед, паглядзі, хто гэта там стукае, – сказала баба.

Адчыніў дзед дзверы, глядзіць – ажно буслы стаяць. Змерзлі, дрыжаць. То адну, то другую нагу падымаюць...

– Ой, баба, зірні, якія госці да нас прыйшлі! - гукнуў дзед.

– Заходзьце, заходзьце хутчэй у хату, – сказала баба.

Упусцілі дзед з бабай буслоў у хату, абагрэлі, накармілі чым толькі маглі.

Паглядзела баба на босыя ногі птушак і кажа:

– Дам я вам, буслы, панчохі цёплыя, каб не мерзлі вашы ногі, а то вёсны ў нас халодныя часта бываюць.

І дала птушкам па пары панчох. Ды толькі панчохі тыя чырвоныя былі, з пафарбаванае пражы.

Надзелі буслы панчохі, і так ім зрабілася добра і цёпла, што і мароз не страшны.

Дзед старое кола на страсе сваёй хаты прыладзіў, і буслы зрабілі сабе новае гняздо, больш надзейнае і трывалае.

Пачалі з таго часу буслы каля людзей трымацца, рабіць свае дамоўкі на стрэхах, на дрэвах, бліжэй да людскіх паселішчаў.

А тыя чырвоныя панчохі, што дала ім добрая бабка, буслы і цяпер носяць.

Клаўдзія Каліна

1. Растлумач, што сведчыць пра тое, што гэта казка.
2. Вызначы падзеі ў гэтай казцы. Дай загаловак кожнай з іх.
3. Складзі план да тэксту. Перадай змест казкі на аснове ўласнага плана.



Праца Маргарыты Дмітрук з кніжкі „Войтэк” Войцеха Міколушко, Варшава 2019, выд. Агора

**1.** Знайдзі ў казцы словы з **ў** (нескладовым). Растлумач іх правапіс.

**Літара ў (нескладовае) пішацца пасля галосных у пачатку, сярэдзіне і ў канцы слова. Ва ўласных імёнах пішацца у (складовае)**
*ва Украіне, да князя Усяслава.*

**2.** Запішы словы паводле ўзору:

**ляцела – ляцеў**
**адпачывала – .....**
**піла – .....**
**сядзела – .....**
**плакала – .....**
**паабедала – .....**

**стамілася – стаміўся**
**апынулася – .....**
**зажурылася – .....**
**засмяялася – .....**
**спынілася – .....**
**баялася – .....**

**3.** Складзі сказы са словамі: аўсянка, ластаўка, кнігаўка, жораў.

**4.** Запішы сказы. У пустыя месцы ўпішы **у** або **ў**.

Побач нашай школы пасадзілі дрэ...цы.
Хлопцы і дзя...чаты за...важылі гэта на ...рок... фізк...льт...ры.
Цяпер б...д...ць іх даглядаць.
Наста...ніца вызначыла дзяж...рствы.
...ладзік і ...ршуля пачынаюць ... бліжэйш...ю пятніц... пасля ...рока... .

**5.** Утвары новыя словы паводле ўзору:

**трава – траўка**
**лава – .....**
**карова – .....**

**галава – .....**
**ніва – .....**
**слова – .....**

# Птушкі ў беларускіх прыказках і прымаўках

Трапіў у **вараны** – каркай, як яны.

Лепей **варона** злоўленая, чым сокал пад небам.

Напужаная **варона** і **вераб'я** баіцца.

**Крумкач** крумкачу вока не выдзеўбе.

**Сарока** сароку бачыць здалёку.

Увосень і **верабей** сыты.

На сваім сметніку і **певень** смелы.

**Ластаўка** вясну пачынае, а **салавей** канчае.

Сядзіць, як **сыч** і думае, што паніч.

Кожная **зязюлька** пра сваё кукуе.

1. Растлумач кожную прыказку і прымаўку.
2. Выберы тры з іх і запішы ў сшытку.



# Адгадай загадкі пра птушак

Ляцеў птах цераз дах,
Сеў на варотах у чырвоных ботах.

Не доктар, а дрэвы лечыць.

Удзень спіць, а ўначы крычыць.

Хапаткія ў мяне крылы,
Хвосцік востры, нібы вілы,
З гліны я гняздо ляплю,
Мошак на ляту лаўлю.
За ўсіх птушак ён чарней,
Чысціць поле ад чарвей.

У стаўку купаўся,
Ды сухім застаўся,
І пайшоў гарласты
У чырвоных ластах.



# Свойская жывёла

**1.** Якую жывёлу разводзяць гаспадары?

**2.** Дапоўні радкі з назвамі звяроў паводле ўзору:

гусь гусак гусяня

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| кабыла | ..... | ..... | ..... | певень | ..... |
| ..... | кот | ..... | качка | ..... | ..... |
| сучка | ..... | ..... | індычка | ..... | ..... |
| ..... | кныр | .... | ..... | бык | ..... |

**3.** Запішы, хто дзе жыве.

Высока на дрэве буслы пабудавалі свае ...... .
Ластаўкі зляпілі ..... пад страхою нашай ..... .
Вавёрка схавалася ў ..... .
Карова хоча выйсці са свайго ..... .
Коні начавалі ў ..... .
Месца, дзе спяць куры, - гэта ..... .
Трусы не выходзяць з ...... .
У сабакі салідная драўляная ..... .
Малая мышка мае сваю ..... .



# Зубры ў Белавежскай пушчы

Мы паехалі ў Белавежскую пушчу паглядзець зуброў. Спыніліся на адным узгорку, чакаем. Хутка прыехаў ляснічы і сказаў:

— Хавайцеся, леснікі гоняць сюды чараду зуброў.

Скокнулі мы за тоўстыя дрэвы, углядаемся. Чуем: моцна трашчыць сухое галлё і кусты.

Неўзабаве ў зарасніку замільгалі дзве чорныя тушы. Яны то поруч, то паасобку беглі проста на нас. Гэта былі старыя самцы. Іх лёгка пазнаць: шырокія рагатыя іхнія ілбы надта зараслі доўгай шэрсцю, якая звісала ўніз барадою.

Зубры, відаць, убачылі нас ці можа пачулі нюхам. Яны абмінулі ўзгорак і, лёгка пераскокваючы цераз паваленыя на зямлі дрэвы, зніклі з вачэй.

Праз некалькі хвілін таксама бокам прамільгнула яшчэ некалькі зуброў.

Разгледзець як мае быць гэтых выдатных жыхароў пушчы мы змаглі толькі ў звярынцы. Былі там старыя самцы, маладыя бычкі і самкі з цялятамі. Маладыя цяляткі, чорныя як жукі, бязрогія, смешныя, з шырокімі ілбамі і шырокім перадам, з вузкім целам, хутка бегалі за сваімі маткамі і мычэлі.

Валянціна Пашкевіч



?

1. Дзе жывуць зубры?
2. Знайдзі сказы, якія апісваюць зуброў?
3. Чым адрозніваюцца цяляты ад дарослых зуброў?

Ларыса Геніюш

# Зубры

Непрыгожыя, барадатыя,
З нетраў пушчы ідуць зубры,
На плячах – вехі-грывы кудлатыя
І цяжкія нясуць гарбы.

То палягуць, то зноў паднімуцца,
Растрывожыўшы трэскам глуш,
Ногі моцныя, аж пружыняцца
Пад цяжарам магутных туш.

Сваёй пушчаю крочаць, стройныя,
Цёмна-бурыя, як дымы,
Неабласканыя, неасвоеныя,
Першабытныя так, як мы.





Без хлусні, без лісінага нораву,
Ў цеснай дружбе – свая сям’я,
Вытрывалыя, непакорныя —
Да такіх належыць зямля!

Ўсе прыходзілі, ўсе іх нішчылі, —
Ад чужынца дабра не пачуць,
А яны грамадой недалічанай
Страпянуцца і зноў жывуць.

Адна пушча-зямля нам маткаю,
Мора жытняе без граніц,
Мы адно жывем чалядкаю,
З адных сілу бяром крыніц.

Ўсё гляджу на сям’ю зубрыную.
З вадапою ў гушчар брыдуць.
І здаецца цяжкай хвілінаю,
Будзем жыць, бо яны жывуць.

Калі пушча цвіце пралескамі,
Плешча сонца вясной з гары —
Беларускія, белавежскія,
З новай сілай равуць зубры.

?

**1.** Якімі словамі аўтарка верша апісвае выгляд зуброў?
**2.** Якія рысы характару ў гэтых звяроў паводле аўтаркі верша?
**3.** Каго напамінаюць паэтэсе зубры?

# Жыў-быў вожык

Нашага вожыка тата знайшоў у лесе і прынёс у кішэні дахаты. Спачатку вожык ляжаў, як клубок. Як паклалі яго ў кутку, пад маім ложкам, так ён і ляжаў. Я наліў яму сподачак малака. А вожык хоць бы што. Тады я лёг побач з ім на падлозе і пачаў назіраць.

На дварэ змяркалася, і пад ложкам рабілася цёмна.

–Дурненькі ты, – сказала мама. – Ты яго толькі не чапай, ён малако знойдзе.

І праўда, толькі я лёг у ложак і ў хаце зрабілася ціха, як у куточку пад ложкам нешта ціхенька заварушылася і зачмыхала:

– Ту-ту-ту-пых! Ту-ту-ту-пых!

А потым на дошках падлогі затупалі маленькія мяккія ножкі.

– А што, не гаварыла я, – сказала мама. – Не палохай, ён малако пачне хлябтаць.

І праўда, мы памаўчалі, і неўзабаве пачулася, што нехта маленькі хлебча. Не так, як кот, а так, як парасяты, плямкае. Вожык тупацеў усю ноч, і за гэта мы пачалі называць яго Тупцікам. А за тое, што ён перастаў нас баяцца, я не забываўся даваць яму есці.



Але не было з кім Тупціку пасябраваць. І стала яму сумна ад гэтага. Каб развесяліць вожыка, я зняў аднойчы са сцяны люстэрка і паставіў на падлозе. А вожык падышоў да люстэрка, наставіў лычык, паглядзеў і надзьмуўся. А той, што ў люстэрку, надзьмуўся таксама, і вось яны разам зрабілі:

– Пых!

Мы засмяяліся – і тата, і я, а Тупцік паглядзеў, асцярожненька дакрануўся лычыкам да шкла і як быццам усё зразумеў. Адышоўся і больш не глядзеў у люстэрка.

А мы занеслі Тупціка ў агарод. Яму цяпер весела, добра на волі.

Янка Брыль

?

1. Адкуль у хлопца з'явіўся вожык?
2. Як вожык піў малако?
3. Як назвалі вожыка? Чаму?
4. Як адчуваў сябе вожык?
5. Чаму вожыка занеслі ў агарод?



Леанід Шырын

# На паляванні

Аж да вечара ад рання
Мы былі на паляванні.
І лісіцу ўпалявалі,
І мядзведзя ўпалявалі,
І сініцу ўпалявалі,
І сароку ўпалявалі,
І варону ўпалявалі,
І цяцерку ўпалявалі,
І вавёрку ўпалявалі
Не ружжом,
Што ёсць у таты, –
Нашым
**Ф о т а а п а р а т а м.**



?

1. Пра якое паляванне гаворыцца ў вершы?
2. Якіх звяроў «упалявалі» героі верша?
3. Запішы назвы гэтых звяроў у алфавітным парадку.
4. Складзі сказы з запісанымі назвамі звяроў.
5. Ці цікавіць цябе фатаграфія?
6. Якія здымкі ты любіш рабіць або глядзець?



# Шануйце ўсё жывое

Як толькі я сябе помню, бацькі мае і старэйшыя людзі – суседзі прывучалі нас, малых, шанаваць усё жывое, што вакол нас.

– Не тапчы травіцы, хадзі сцежачкай. Трава вырасце. Яе скосяць – будзе сена кароўкам, каню...

– Не чапай, не ламай гэтага дубочка або сасонкі. З іх вырастуць вялікія дрэвы.

– Асцярожна рві яблыкі – не паламай, не адвіхні галінку. Дрэва будзе хварэць, на паламаным суку не будзе яблыкаў...

– Праз жыта нацянькі не хадзі. Калі патопчаш яго, будзе менш хлеба...

– Як толькі я сябе помню, штодня даводзілася пачуць нешта новае і цікавае.

– Гэта зёлка – дзівасіл. Калі выкапаць і высушыць яго карэнне – будзе зелле ад болю ў грудзях...

– Гэтая прыгожая красачка – васілёк. Калі яе высушыць – будзе зелле ад хваробы вачэй...

З маленства расло ў мяне замілаванне да прыроды. Нават крапіву я не збіваў кіем. Яна ж расце таксама на карысць чалавеку.

Любіў я, заўважыўшы ў лесе прыгожую кветку-зёлку, выкапаць яе з зямлі і прынесці ў агарод, бо ведаў, што кожная зёлка мае нешта сваё добрае і патрэбнае людзям.

Уладзімір Дубоўка

?

1. Якія парады давалі дарослыя дзецям?
2. Якія рысы характару выхоўвалі бацькі ў малых?
3. Пра якія лекавыя расліны ўзгадвае аўтар тэксту?
4. Як разумееш выраз: «расло ў мяне замілаванне да прыроды»?





Вывучы словы песні

Міра Лукша

# Лось з Ласінкі

Лось Алесь з ласіхай Лесяй
Век жылі ў нашым лесе,
Ды бяздзетныя былі,
Ласянят не нажылі.
А калі ўжо пастарэлі,
Ласянятачка займелі

Прыпеў: А маленькі лось Алесь
Кропля ў кроплю – татка ўвесь!
Рады вельмі мама з таткам;
Вось на славу ласянятка.

Ласянятка добры лёс
На пацеху ім прынёс.
Ножкі дыгнастыя,
Галоўка лабастая,
Глядзелкі вачастыя,
Па узлеску шастае!

Прыпеў: А маленькі лось Алесь
Кропля ў кроплю – татка ўвесь!
Рады вельмі мама з таткам;
Вось на славу ласянятка.



## Тэмы:

1. Радаслоўнае дрэва.
2. Сям'я. Сваякі.
3. Мой дом.
4. Апостраф.
5. Музычныя інструменты.
6. Прафесіі.
7. Надыход зімы.
8. Колеры снегу.
9. Лік назоўнікаў.
10. Песня «Валёначак святога Мікалая».

# Радаслоўнае дрэва



# Сям'я. Сваякі.

**сваяк / родны**

**сямейнікі / чальцы сям'і**

**бацькі – мама** (маці, матуля, мамка, мамачка, мамуля, мамулька, мамулечка, мамуленька, мамуська, мамусенька) і **бацька** (тата, татка, татачка, татуля, татулька, татулечка, татуленька, татуська, татусенька, татухна)

**хросны бацька, хросная маці**

**муж і жонка**

**брат і сястра**

**сын і дачка**

**дзед** (дзядуля, дзядулька, дзедка, дзядуся) і **баба** (бабуля, бабка, бабуся, бабулька, бабусенька, бабця)

**прадзед, прапрадзед і прабабка, прапрабабка**

**унук** (унучак, унучачак) і **унучка** (унучачка)

**прашчуры / продкі** – усе ранейшыя пакаленні тваіх сваякоў

**нашчадкі** – усе пазнейшыя пакаленні тваіх сваякоў

**цётка** – маміна ці татава сястра

**дзядзька** – бацькаў ці мамін брат

**стрыечныя браты і сёстры** – дзеці дзядзькі або цёткі



# Мой дом

У кожнага з нас ёсць дом. У каго ў горадзе, у каго ў вёсцы. Першы мой дом, дзе прайшло маё маленства, асабліва мне дарагі.

Паспрабуйце спярша ў думках, а пасля на паперы ў альбоме намаляваць свой дом. Які ён? Што асабліва адметнае і дарагое ў вашым доме і паблізу яго – двор, дрэвы, вуліца, мясціны, дзе вы з сябрамі гулялі ў свае любімыя гульні? А самыя родныя і блізкія вам людзі, суседзі, знаёмыя? І яны ўсе ў вас перад вачыма.

Мая карціна таксама называецца «Мой дом». Гэта дом, у якім я нарадзіўся і вырас. Некалі ён мне здаваўся вельмі вялікім. Але кожны раз, калі я падыходжу да майго дома, да мяне вяртаецца маё маленства. Вось зусім яшчэ маладая мая маці. Успамінаю свайго бацьку.

Так складалася гэта карціна. У кожнага – свой дом, сагрэты цяплом і ласкай блізкіх людзей.

Мне хацелася, каб кожны, хто будзе глядзець гэту карціну, успомніў сваё маленства. Мне ў маім доме і вакол яго дарагая кожная прыкмета.

Вось паўз наш дом грукатам пралятаюць цягнікі. Праводзячы іх вачыма, хацелася і самому ляцець за імі ўслед, каб убачыць яшчэ неспазнанае і невядомае.

Тут, у маім вясёлым чырвоным доме з раскрытымі насцеж вокнамі, усё мне так блізка і дорага. Мае суседзі, мае сябры – усе простыя і добрыя людзі. Кожны заняты сваёй работай, у кожнага – свой клопат.

З дома, дзе мы нарадзіліся, пачынаецца Радзіма. Стаўшы дарослымі, мы яшчэ мацней любім яе. І кожны з нас гатовы берагчы, шанаваць і свой дом і сваю Радзіму.

Васіль Сумараў

?

1. Раскажы пра сваіх блізкіх.
2. Хто твае бабулі і дзядулі?
3. Адкуль яны?
4. Дзе жылі твае продкі? Адкуль яны?

# Апостраф

**1.** Прачытай уважліва пары слоў і звярні ўвагу на апостраф (’).
Што ён абазначае?

зелле – з’есці
семя – сям’я

песня – п’еса
дварэ – надвор’е

абед – аб’езд
зямля – з’ява

Раздзельнае вымаўленне зычных перад **і, е, ё, ю, я** на пісьме передаецца пры дапамозе **апострафа**.

**2.** Спішы сказы. Падкрэслі словы з апострафам. Растлумач іх напісанне.

Вераб’і сядзелі побач нашага пад’езда.

Ганупя павесіла на сцяне сваю аб’яву.

Летам п’ём многа вады.

У нашай сям’і ўсе любяць чытаць кніжкі.

Дзеці з’язджалі на лыжах з невялікай горкі.

Па-мойму, гэта было аб’ектыўнае выказванне.

Заўтра пойдзем у тэатр на прэм’еру п’есы маладога рэжысёра.

Учора было такое надвор’е, што ўсе дрэвы ў нашым парку аб’інелі.

Ён выскачыў раптоўна з-за куста, быццам нейкі д’ябал.

Камп’ютар дапамагае мне ва ўроках.

Аб’яднанне АБ-БА — выдавец гэтага падручніка.

**3.** Складзі сказы са словамі:

уз’ехаць, узгор’е, бар’ер, сур’ёзна, разаб’ецца, з’езд, з’явіўся.

**Васіль Вітка**

# Прафесіі

Даглядае пчол **пчаляр**,
А майструе стол **сталяр**,
Шыбы ў вокны ставіць **шкляр**,
Сцены беліць нам **маляр**,
Чысціць комін **камінар**,
Сыры варыць **сыравар**,
Ну а цукар – **цукравар**.

З футра выкраіў каўнер
Мне на паліто **кушнер**,
Боты мне пашыў **шавец**,
Новыя штаны – **кравец**.

Цяпер сам разбяры,
А што робяць **муляры**,
**дактары, друкары**?



дантыст



інфарматык



сталяр




настаўніца



мастак



механік




паліцыянт



бібліятэкарка



бухгалтарка



камінар

**Васіль Жуковіч**

# Сямейны аркестрык

Наш аркестрык сямейны –
ён крыху малаваты,
ды заўсёды надзейны:
усе мы з адной хаты.

Грае маміна скрыпка,
грае татаў баян.
І, вядома, не дрэмле
побач мой барабан.



Наш вясёлы аркестрык
дружны, хоць малаваты,
дырыжора-маэстра
не чакаем на святы.

Грае маміна скрыпка,
грае татаў баян.
Хто галоўны ў аркестры?
Можа, мой барабан?

Мы суседзям гралі,
і суседзі сказалі,
што нам час падавацца
ды на сцэну палаца!

Грае маміна скрыпка,
грае татаў баян.
Хто галоўны ў аркестры?
Змоўкні ты, барабан!



1. Пералічы музычныя інструменты з аркестра ў вершы.
2. Хто, па-твойму, галоўны ў аркестры?
3. Ці ты граеш на якім-небудзь музычным інструменце? Назаві яго.



# Якога колеру снег?

Мой любы дружа, адкажы, калі ласка: якога колеру снег?

Белы? Так, белы. Але не заўсёды. Ці прыглядаўся ты да яго ўважліва-ўважліва? Бачыў, што ён можа быць і шэрым, і ружовым, і блакітным – у залежнасці ад надвор'я і яскравасці сонейка?

Вось выйдзеш на вуліцу – паўзірайся ў гэтае снежнае зіхаценне. Яно рознакаляровае! Толькі колеры гэтыя не яркія, а ледзь прыкметныя...

Раскажу табе казку.

Жыла-была Сняжынка. Яна была маленечкая, але вельмі прыгожая. Ёй падабалася, як яна зіхаціць і пераліваецца на сонцы. Калі мама-воблака выпусціла Сняжынку пагуляцца, наша прыгажуня лётала-лётала дый апынулася на галінцы дрэва. Азірнулася навокал і заўважыла хлопчыка, якому было чатыры ці пяць гадкоў. Хлопчык сядзеў на санках і змрочна глядзеў на ўзгорак, што быў паблізу. На тым узгорку дзеці весела і шумна коўзаліся на санках.

– Авоечкі, што ж здарылася? – падумала Сняжынка і скіравалася на шалік хлопчыка. – Здароў! Чаму ты такі змрочны?

Хлопчык спачатку здзівіўся, што з ім размаўляе нейкая сняжынка, але тут жа ізноў надзьмуўся і непрыхільна адказаў:

– Табе што за клопат?

– Як гэта што за клопат?! Я ж сняжынка! Сняжынкам заўсёды ёсць клопат да змрочных хлопчыкаў, асабліва ўзімку! – захвалявалася Сняжынка.

– Чаму асабліва ўзімку? А ўлетку што – табе будзе ўсё адно, хто змрочны, а хто вясёлы?

– Гэх, ты ж ведаеш, што я растану ўжо вясной, – зажурылася Сняжынка. – Таму мне вельмі важна, каб узімку, калі я яшчэ такая прыгожая і вясёлая, – усе навокал весяліліся разам са мной! Дарэчы, як цябе клічуць?

– Станіслаў мяне клічуць. І я не буду весяліцца! Не люблю тваю зіму! Няхай вунь яны весяляцца! А я не хачу! – бурчэў хлопчык, скасавурыўшыся на дзяцей, што гуляліся на ўзгорку.

– Чаму ж ты так не любіш зіму?

– Яна непрыгожая!

– Як гэта непрыгожая?!

– Яна халодная! І... і нецікавая! Яна толькі белая ці шэрая!

– Ну-у-у, Стасічак... З тым, што яна халодная, я, можа, і пагаджуся. Дык ты ж цёпла апрануты – табе гэта не страшна. Што да астатняга... Яна вельмі цікавая! Паглядзі, колькі ўсяго навокал! Колькі гульняў ды забавак! Санкі, канькі, лыжы, хакей, снежкі, снежныя гарадкі, можна зляпіць снегавіка, можна... Ды ўжо цікава проста хадзіць па снезе і слухаць, як ён рыпіць пад нагамі! Гэта ж музыка! – Сняжынка аддыхалася і дадала: – І няпраўда, што яна толькі шэрая ці белая! Паглядзі ўважліва на мяне. Бачыш, якая я цікавая і рознакаляровая? Вось гэтая мая галінка – ружаватага адцення, гэтая – жоўценькага, сярэдзінка – блакітнага. А гэтай галінцы – паглядзі, якая смешная – спадабаўся твой шалік! І яна пазычыла ў яго прыгожы зеленаваты колер...

– І сапраўды, – здзівіўся хлопчык.

Яны яшчэ доўга размаўлялі пра зімовыя забавы і колеры...

Кожную зіму сустракаліся Сняжынка і Станіслаў. Неўзабаве хлопчык вырас. Ён стаў мастаком. І вельмі палюбіў маляваць зіму – прыгожую і рознакаляровую.

Паглядзі ўважліва на гэтыя карціны. Гэта рэпрадукцыі твораў вядомага мастака Станіслава Жукоўскага. Пашукай розныя адценні снегу на гэтых выявах.

Віталія Глаз





**Міхась Андрасюк**

# Белая сняжынка

Першую белую сняжынку
нясу нясмела у далонях.
Яе жыццё – адна хвілінка,
яе сястра – сляза салёна.

Першая белая сняжынка...
Мо ўжо зіма, мо яшчэ восень?
Першая белая сняжынка
холаду пах з сабой прыносіць.

А раніцай да ўсходу сонца
снежань гамоніць ля парога.
Глядзі, на двары за аконцам
белае поле, лес, дарога.

Эх, гэта белая сняжынка
прыносіць у сэрца неспакой.
Яе жыццё адна хвілінка
між жоўтай восенню й зімой.

?

1. Які настрой у вершы? Абгрунтуй свой адказ.
2. Як паэт апісвае сняжынку?



## Большасць назоўнікаў мае два лікі: адзіночны і множны

(стол – сталы, сняжынка – сняжынкі, пяро – пёры).

Адзіночны лік назоўніка абазначае адзін прадмет ці з'яву: лес, шапка, яйка.

Множны лік назоўніка абазначае два і больш прадметаў: лясы, шапкі, яйкі.

Ёсць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку: цукар, соль, моладзь, весялосць, лічэнне, Орля.

Ёсць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку: дрожджы, дзверы, дровы, акуляры, нажніцы, канікулы, Татры, Малінікі.

**1.** Пастаў назоўнікі ў множным ліку:

| | |
|---|---|
| карціна – ..... | брат – ..... |
| вучаніца – ..... | мароз – ..... |
| парта – ..... | холад – ..... |
| дошка – ..... | снегавік – ..... |
| нага – ..... | настаўнік – ..... |
| кветка – ..... | горад – ..... |

**2.** Вызначы лік наступных назоўнікаў:

птушаня, грошы, імяніны, дрэвы, лісток, алоўкі, вішні, граблі, нажы, тыдні, вушы, агні, Тыневічы, жалуды, вочы, сані, хованкі, вусны.

**3.** Складзі сказы са словамі:

канікулы, вароты, Ляўкова, Крынкі, жмуркі, шашкі.

Вывучы словы песні

Уладзімір Някляеў

# Валёначак святога Мікалая

На Каляды каляровыя карункі,
На Каляды карагоды, падарункі,
Месяц срэбраны і зорка залатая
У валёначку святога Мікалая.

Мікалай падыдзе вечарам да весніц,
Празвініць яго званочак на падворку.
Над адным тваім акном узыйдзе месяц,
Над другім тваім акном узыдзе зорка.

Прыпеў: На Каляды дзіва праўдзіцца любое,
На Каляды ўсе малітвы Бог пачуе,
З аднаго акна ты глянеш у другое
І ў падворку месяц зорку пацалуе.

Ты прачнешся ўся шчаслівая на ранку
І раскажаш мне пра цуд, які прысніўся.
І цябе я пацалую на світанку,
Каб твой сон калядны на світанку збыўся.

Прыпеў: На Каляды дзіва праўдзіцца любое...



# Тэмы:

1. Поры года.
2. Месяцы.
3. Песня «На Каляды».
4. Скланенне назоўнікаў.
5. Гагатуха.
6. Чарадзейныя фарбы.
7. Тыдзень.
8. Зімовыя гульні.
9. Звяры зімою.
10. Яканне.

Ларыса Геніюш

# Год і яго род



Пасклікаў стары год дочак,
Пасадзіў усіх у радочак,
І пытае: – Што, вясна,
Ты мне, бацьку, прынясла?
– Я прынесла травы, кветкі,
Птушак у небе,
Рыбу ў сетках,
Сонца, ветрык па дубровах,
Маладосці спеў вясновы,
Паклікала салаўя,
Каб табе пяяў, як я!



– А я, лецейка, іду з хлебам,
Нясу ягад, колькі трэба,
Саграваю ўсё жывое,
Стаю ў сонцы прад табою,
Заграбаю сенажаці,
Адчыняю вокны ў хаце,
Людзям – збожжа, умалот,
Птушкам – гнёзды, пчолам – мёд.



– Я, татулю, твая восень.
Змалаціла ўсё калоссе,
У садзе яблыкі паспелі,
Птушкі ў вырай адляцелі,
Ужо арэхаў назбірала,
Бульбу ў полі пакапала,
Ёсць у зарасцях грыбы,
І атава ля вярбы.
Працавала за дваіх,
Хопіць хлеба для ўсіх!

– Я зіма, мой гнеў заўзяты,
Лепш схавайся, тата, у хату,
Усё марожу, дзе прайду,
Пражу белую праду,
Тку палотны з белай ніткі,
Калі хочаш, іней вытку
І ўбяру ялінам лапы,
Замарожу вокны ў хатах
І ўсюды зраблю лёд,
Каб паслізгаўся народ.
Усё прыдбана, прыхавана,
Каб хапіла пажадана,
Ёсць каўбасы, каравай.
Еш, дзядусь, і спачывай!

Яшчэ сын йдзе, Новы год,
Вось і ўвесь дзядулеў род!







1. Пра якія дочкі распавядае ў вершы Ларыса Геніюш?
2. Што дорыць кожная з іх?
3. Якая твая любімая пара года? Абгрунтуй свой адказ.
4. Запішы сказы:

**Зімовыя месяцы гэта: ....., ....., ..... .**

**Веснавыя месяцы гэта: ....., ....., ..... .**

**Летнія месяцы гэта: ....., ....., ..... .**

**Асеннія месяцы гэта: ....., ....., ..... .**

**каляндар**

**год**

**пара года / сезон**

**месяц**

**квартал –** тры месяцы

**паўгоддзе**

**дзесяцігоддзе**

**стагоддзе / век**

**штомесяц –** кожны месяц

**штогод –** кожны год

**летась –** у мінулым годзе

**сёлета –** у гэтым годзе

**налета –** у наступным годзе

**Якая сёння дата? Сёння сёмае студзеня.**
**Калі святкуем Каляды? Сёмага студзеня.**

### Уладзімір Някляеў

# На Каляды

Над Крэвам сцямнела і першая зорка ўзышла
Зусім маладая.
І свеціць няўмела.
Пакуль ты шукала, пакуль ты мяне не знайшла
Над Крэвам сцямнела.

Рачулка знямела пад лёдам, суцішыўшы бег.
Завея саспела.
Прыйшлі снегапады.
Пакуль ты на ганку змятала з валёначак снег,
Насталі Каляды.

Прыпеў: На Каляды, на Каляды
Снегапады, снегапады.
Не праехаць, не прайсці –
Падымайся і ляці.
Як сняжынка, як сняжынка
Ад сцяжынкі да сцяжынкі,
Ад ялінкі да ялінкі
У мае абдымкі.

Званы зазвінелі. Хрыстос усміхнуўся з нябёс
Калядная зорка то гасла, то ззяла.
Ты рады пытала.
Што гэтакі выпаў нам лёс
Які выпаў лёс – не казала.

Прыпеў: На Каляды, на Каляды...



# Казка пра крылы

Гэта адбылося на пачатку часоў, калі лятаць умелі толькі анёлы. Адзін з іх, яшчэ зусім няўмелы і нязграбны, упусціў на зямлю свае крылы.

Першай убачыла іх змяя. «Во дык шанцуе! – падумала яна. – Зараз я буду крылатай і прыўкраснай, як анёл». Але, пабачыўшы яе ў небе, людзі і звяры разбягаліся ў жаху: набыўшы крылы, змяя пераўтварылася ў цмока. Расчараваная змяя скінула крылы.

Крылы знайшоў сабака. Ён не стаў іх надзяваць, а аднёс чалавеку, якога вельмі любіў. А чалавек аніяк не мог вызначыцца, што зрабіць. З аднаго боку, з крыламі ён мог бясконца лётаць у аблоках, будаваць паветраныя замкі і быць на сёмым небе ад шчасця. З іншага боку, сорамна было прысабечкаць чужую рэч, дый пасля здарэння са змяёй ён баяўся, што гэтыя крылы прынясуць яму толькі няшчасце...

Пакуль ён разважаў, анёльскія крылы па пёрку расцягнулі птушкі, якія шпацыравалі непадалёк. З таго часу птушкі пачалі лятаць. А вось чалавек можа лятаць толькі ў сне...

Ганна Сілівончык

?

1. Чаму крылы ляжалі на зямлі?
2. Хто першы пакарыстаўся імі?
3. Каму аднёс крылы сабака?
4. Што зрабіў з крыламі чалавек?
5. Зрабі малюнак да казкі.



У сказе назоўнікі звязаны з іншымі словамі. Яны прымаюць розныя формы, змяняючы свае канчаткі. Напрыклад: **Зіма** – прыгожая пара года. Люблю **зімой** гуляць на панадворку. Чытаю верш аб **зіме**. Люблю снежную **зіму**. У гэтых сказах назоўнік **зіма** змяняецца у залежнасці ад сэнсу сказа.

**Назоўнік змяняецца па склонах.**
**Назоўнікі скланяюцца.**
**У беларускай мове шэсць склонаў.**

Кожны склон назоўніка адказвае на акрэсленае пытанне:

Назоўны – хто? што?
Родны – каго? чаго?
Давальны – каму? чаму?
Вінавальны – каго? што?
Творны – кім? чым?
Месны – аб кім? аб чым?

**1.** Адкажы на пытанні:

Хто стаіць побач Зосі?
Каго няма сёння ў школе?
Каму прыглядаецца Оля?
Каго бачыш у школе?
З кім ідзеш у школу?
Аб кім ты думаеш?

Што стаіць каля акна?
Чаго няма ў нашым класе?
Чаму прыглядаецца хлопец?
Што бачыш за акном?
З чым ідзеш у школу?
Аб чым ты думаеш?

**2.** Пастаў пытанні да выдзеленых назоўнікаў.

За акном **зіма**.
Усю **зямлю** прыкрыў бялюткі **снег**.
**Хлопчык** са сваёй **мамай** гулялі на **снезе**.
Яны зляпілі невялікага **снегавіка**.

**3.** Закончы сказы. Карыстайся словамі: школа, парта, дарога, кніжка, сяброўка, настаўніца, вуліца, нага, рука.

**Дзеці на перапынку гуляюць са сваёй ..... .**

**Я доўга не мог знайсці гэтай ..... .**

**Гэты баравік вырас зараз пры ..... .**

**Гадзіннік нашу на левай ..... .**

**Я люблю сваю ..... .**

**Усе свае сшыткі і падручнікі кладу на сваёй ..... .**

**Паўлік пазычыў мне прыгодніцкую ..... .**

**Доўга скачы на правай ..... .**

**Заўтра іду ў кіно са сваёй ..... .**

**4.** Дапішы канчаткі назоўнікаў у словазлучэннях:

**купіць Нін...**

**стаяць з кніжк...**

**паставіць на паліц...**

**выціраць дошк...**

**бачыць жанчын...**

**гаварыць мам...**

**расказаць казк...**

**5.** Вывучы верш Сяржука Сокалава-Воюша.

**Нам**
**Рымша**
**Дровы**
**Вёз**
**Трашчаў**
**Мароз**

# Панна Марыя

**Панна Марыя**
**на прыстоле стояла,**
**два крыжыэ трымала,**
**а трэтым кадыла.**
**Кадытэся людэ,**
**хто в цэркви будэ,**
**а хто нэ будэ –**
**Богу свічку ставтэ,**
**а на піруог дайтэ.**
**Клё, клё, клё!**
**Одчыняй пані окно.**
**На тобіе Хрыстка,**
**дай нам пірожка.**



Гэта песня, якую ў Арэшкаве спявалі на свята Вадохрышча.

**1.** Калі праваслаўныя святкуюць Новы год? Ці ведаеш чаму?

**2.** Спытай у сваіх бабулі і дзядулі:

1) Якія стравы елі людзі ў навагоднюю ноч?

2) Як маладыя людзі паводзілі сябе ўвечары напярэдадні Новага года?

3) Чым яны займаліся?

# Чарадзейныя фарбы

Адзін раз у сто год самы добры з самых добрых старых – Дзед Мароз – у пераднавагоднюю ноч прыносіць сем чарадзейных фарбаў.

Гэтымі фарбамі можна намаляваць усё, што захочаш, і намаляванае – ажыве.

Хочаш – намалюй карабель і плыві на ім... Або зоркалёт – і ляці да зор. А калі табе патрэбна намаляваць што-небудзь больш простае, напрыклад, крэсла, – калі ласка... Намалюй і сядай на яго. Чарадзейнымі фарбамі можна намаляваць што хочаш, нават мыла, і яно будзе мыліцца.

Таму Дзед Мароз прыносіць чарадзейныя фарбы самаму добраму з усіх самых добрых дзяцей.

І гэта зразумела... Калі такія фарбы трапяць у рукі злому хлопчыку ці злой дзяўчынцы – яны могуць нарабіць шмат бяды. Варта, скажам, гэтымі фарбамі дамаляваць сабаку рогі, курыцы – вусы, а кошцы – горб, і будзе сабака – рагатым, курыца – вусатай, а кошка – гарбатай.

Вось чаму Дзед Мароз вельмі доўга правярае сэрцы дзяцей, а затым ужо выбірае, каму з іх падарыць чарадзейныя фарбы.

У апошні раз Дзед Мароз падарыў чарадзейныя фарбы аднаму самаму добраму з самых добрых хлопчыкаў.

Хлопчык вельмі ўзрадаваўся фарбам і адразу пачаў маляваць. Маляваць для іншых. Таму што ён быў самым добрым з самых добрых хлопчыкаў. Ён намаляваў бабулі цёплую хустку, маме – прыгожую сукенку. Сляпому дзядулю хлопчык намаляваў вочы, а сваім сябрам – вельмі вялікую школу...

Ён маляваў не разгінаючыся цэлы дзень і ўвесь вечар... Ён маляваў і на другі, і на трэці, і на чацвёрты дзень... Ён маляваў, жадаючы людзям дабра. Маляваў да таго часу, пакуль не скончыліся фарбы. Але...

Але ніхто не мог скарыстаць намаляванае. Хустка, намаляваная бабулі, была падобна да анучы для мыцця падлогі, а сукенка, на-

маляваная маці, была крывабокай, стракатай і цеснай. Маці не стала нават прымерваць яе. Вочы для сляпога нагадвалі дзве блакітныя кляксы, і ён не мог імі бачыць. А школа, якую вельмі старанна маляваў хлопчык, атрымалася такой страшнай, што блізка да яе баяліся падыходзіць. Хісткія сцены. Дах набакір. Крывыя вокны. Касыя дзверы... Страшыдла, а не дом. Нязграбны будынак не захацелі ўзяць нават для склада.

Так на вуліцы з'явіліся дрэвы, падобныя да старых мяцёлак. З'явіліся коні з драцянымі нагамі, аўтамабілі з нейкімі дзіўнымі круклякамі замест колаў, самалёты з вельмі цяжкімі крыламі, электрычныя правады таўшчынёю з бервяно, кажухі і паліто,



у якіх адзін рукаў даўжэйшы за другі... Так з'явіліся тысячы рэчаў, якія нельга было скарыстаць, і людзі жахнуліся.

– Як ты мог нарабіць столькі зла, самы добры з самых добрых хлопчыкаў?

І хлопчык заплакаў. Яму так хацелася зрабіць людзей шчаслівымі, але, не ўмеючы, ён дарэмна змаляваў фарбы.

Хлопчык плакаў так гучна і няўцешна, што яго пачуў самы добры з усіх самых добрых старых – Дзед Мароз. Пачуў і вярнуўся да яго. Вярнуўся і паклаў перад хлопчыкам фарбы.

– Толькі гэта, мой дружа, простыя фарбы... Але яны могуць стаць чарадзейнымі, калі ты пажадаеш гэтага...

Так сказаў Дзед Мароз і знік...

Мінуў год... Мінула два гады. Мінула многа і вельмі многа год. Хлопчык стаў юнаком, затым дарослым чалавекам, а пасля старым... Ён усё жыццё маляваў простымі фарбамі. Маляваў дамы. Маляваў твары людзей. Адзенне. Самалёты. Масты. Чыгуначныя станцыі. Палацы...

І надышоў час, насталі шчаслівыя дні, калі намаляванае ім на паперы пачало пераходзіць у жыццё...

З'явілася шмат выдатных будынкаў, узведзеных па яго малюнках. Паляцелі цудоўныя самалёты. З берага на бераг перакінуліся незнаёмыя масты... І ніхто не хацеў верыць, што ўсё гэта было намалявана простымі фарбамі. Усе называлі іх чарадзейнымі...

Так здараецца на белым свеце... Так здараецца не толькі з фарбамі, але і са звычайнай сякерай або швейнай іголкай і нават з простай глінай... Так здараецца з усім тым, да чаго дакранаюцца рукі самага вялікага чарадзея з самых вялікіх чарадзеяў – рукі працавітага, настойлівага чалавека...

Яўгеній Пярмяк

?

1. Хто герой гэтага апавядання?
2. Што можаш пра яго сказаць?
3. Чаму вучыць нас гэтае апавяданне?

**Мікола Чарняўскі**

# Жыў на свеце дзядзька Тыдзень

Жыў на свеце дзядзька
          Тыдзень,
Працаваць любіў і ўмеў.
Трох сыноў меў дзядзька
          Тыдзень
І дачок чацвёра меў.

Вельмі дружная сямейка:
Кожны рупны, усёўмейка,
Кожны – зграбны,
Кожны – увішны,
У сваёй сям'і не лішні.

Палічылі, колькі іх?
Правільна –
СЯМЁРА ўсіх!
Як і мы, шаноўны Тыдзень
На дзяцей
Не быў у крыўдзе:
Паслухмяныя яны,
Дочкі ўсе і ўсе сыны.
Як на раду клікне іх –
Дык збяруцца ў той жа міг!






**1.** Пералічы і запішы ўсе сямёра дзяцей дзядзькі тыдня.
**2.** Запішы сказ і падай свой любімы дзень тыдня.

**Мой любімы дзень гэта ..... .**

**3.** Вывучы верш:

**Дзе два хлопчыкі – удвух,**
**Дзе дзяўчынкі дзве – удзвюх,**
**Дзе яна і ён – пра іх**
**Кажуць, што яны ўдваіх.**

**дзень / суткі**
**штодзень – кожны дзень**
**штотыдзень – кожны тыдзень**
**штоноч – кожну ноч**
**учора, заўчора / пазаўчора**
**заўтра, паслязаўтра / пазаўтра**





# Лыжы

## I

У маленькім завулку вялікага горада стаяў чырвоны цагляны домік. У ім жылі па суседстве дзяўчынка Ніна і хлопчык Сеня.

Аднаго разу Ніна і Сеня сядзелі каля акна і пазіралі на двор. За акном пушынкамі падаў снег. Белы дыван заслаў увесь завулак. Плот і веснічкі надзелі мяккія пушыстыя шапкі. А снежныя матылькі ўсё кружыліся і кружыліся...

– Эх, як добра было б пакатацца! – уздыхнула Ніна.

Але як гэта зрабіць? У яе ёсць лыжы, але на іх парваліся раменьчыкі, ды і палак няма.

– Ведаеш што, Ніна, я адрамантую твае лыжы, а ў мяне ёсць палкі, будзем катацца. Добра? – прапанаваў Сеня.

– Добра, – адказала дзяўчынка.

Так у Ніны і Сені з'явіліся лыжы. Дзеці хадзілі ў школу ў розныя змены, дык Сеня катаўся зранку, а Ніна – пасля абеду.

## II

Усё ішло добра. Але вось насталі зімовыя канікулы. Аднойчы ім захацелася абаім пакатацца зранку. А лыжы адны. Заспрачаліся, і ніхто з іх не захацеў саступіць.

Дзяўчынка казала, што лыжы яе, а Сеня даводзіў сваё:

А хто іх адрамантаваў? А палкі чые?

Разззлаваўшыся, яны пачалі вырываць адно ў аднаго лыжы. Пасля хлопчык адарваў раменьчыкі, забраў свае палкі і пайшоў дадому.

## III

Стаяць у калідоры ў адным кутку лыжы з адарванымі раменьчыкамі, а ў другім – палкі.

Прыйшлі з работы іхнія мамы, паглядзелі на сваіх дзяцей і зразумелі, за што не паладзілі дзеці. Узялі палкі і закінулі на гарышча.

Сядзяць хлопчык і дзяўчынка дома і глядзяць праз акно на двор. А снег вялікімі пушынкамі ўсё ляціць, усё падае.

Сеня моўчкі ўстаў і палез на гарышча. Дастаў лыжы, схаваўся ў дрывотні і пачаў зноў прыладкоўваць раменьчыкі. Зрабіў як след, памазаў іх, каб добра слізгацелі.

«Пайду скажу Ніне, што зноў лыжы спраўныя. Няхай ідзе першая пакатацца», – падумаў хлопчык.

## IV

Але дзяўчынкі дома не было. Тады Сеня пайшоў да яе сяброўкі і, не знайшоўшы там Ніны, вярнуўся дахаты, каб узяць лыжы ды пакатацца самому.

Глянуў, а лыжаў няма. Не разумеючы, куды дзеліся лыжы, ён, засмучаны, паплёўся на горку. І раптам бачыць, што на горку ўзбіраецца Ніна на лыжах.

– Ну, я табе пакажу! – гукнуў раззлаваны Сеня.

Але дзяўчынка была высока на горцы і не пачула пагрозы. Яна лёгка адштурхнулася і віхрам зляцела ўніз.

У хлопчыка аж дух заняло.

– Вось гэта здорава! – падумаў Сеня.

Тут  Ніна крута развярнулася і памчалася па снежным полі. Сеня нават забыўся на сваю пагрозу і, калі дзяўчынка параўнялася з ім і хацела аддаць лыжы, сказаў:

– Не трэба. Катайся, а я пасля...

Ніна ўсміхнулася і пачала ўзбірацца на горку.

Клаўдзія Каліна

?

1. Як у Ніны і Сені з'явіліся лыжы?
2. Праз што ўзнікла спрэчка?
3. Як закончылася сварка?
4. Што вырашыў зрабіць Сеня?
5. Дзе хлопец сустрэў сяброўку?
6. Што зрабіў Сеня, сустрэўшы Ніну?
7. Чаму Сеня не забраў лыжаў?
8. Прыдумай загалоўкі да кожнай часткі апавядання.



Паўлюк Трус

# Зіма

Зіма... І золкія завеі...
Дарогі снегам замяло.
Таполі ў наквеці сівеюць.
І нікнуць бомы за сялом.

Як здані, белыя бярозы
Да болю жырацца ў прастор.
На іх узорныя марозы
Чароўны выткалі ўзор.

Нямая бель... Гаі... Дубровы...
Маўчаць за возерам стагі,
Згубілі вербы каляровасць,
А там... снягі... снягі...
Снягі...
Які прастор... У прасторы іней...
Я сам не ведаю, чаму
Люблю заснежаны раўніны
І беларускую зіму!

Зіма!.. Зіма!.. У палях туманы...
Нервова плачуць палазы.
Бялеюць сонныя паляны
У завеях дзікае красы.

У далінах ноч... Імчацца коні...
А бомы ўсліпваюць да слёз.
У такім аснежаным разгоне
Не страшны замеці й мароз!..

?

1. Які настрой верша?
2. Якія пачуцці выклікае ў цябе гэты верш?
3. Да чаго ён цябе заахвочвае?
4. Колькі строфаў у вершы?
5. Прачытай усе пары слоў, якія рыфмуюцца. Запішы іх у сшытак.





# Словы на снезе

Зіма лютуе ўсё мацней. Насыпае больш глыбокія снежныя сумёты.

На дарогах гурбы.

Яры і канавы замяло да краёў. У барах і гаях пад цяжарам снегу згінаюцца і нават ломяцца маладыя хвойкі і бярозкі.

Калі заціхне мяцеліца і засвеціць скупое зімовае сонца, на свежым снезе відаць розныя сляды. Яны, як словы ў цікавай кнізе, расказваюць пра клопаты і прыгоды звяроў і птушак. Апавядаюць пра іх цяжкае жыццё ў самую суровую пару года.

Ні ў лесе, ні ў полі не знойдзеш ніякага корму. Рыба ў азёрах задыхаецца пад тоўстым панцырам з лёду і снегу.

Міхась – сябар прыроды.

У вольны час ён становіцца на лыжы і вязе да хмызняку на краі поля ахапак канюшыны ці духмянага сена. Там кладзе яго ў куст на такой вышыні, каб заяц, падняўшыся на заднія лапы, мог дастаць.

Міхась знарок выбірае куст не вельмі шырокі і замацоўвае ахапак так, каб заяц не вырваў яго ўвесь адразу і не расцярушыў сена па снезе.

Шэры і сам сабе можа пашкодзіць, бо, вядома ж, у зайца і розум заечы.

Тут жа побач Міхась кладзе прыхопленую з сабой моркву ці бурачок, каб і на дэсерт шэраму было чым паласавацца.

Во колькі ён ноччу напятляў тут слядоў, а цяпер спіць дзе-небудзь пад кустом!

І Міхась запрашае:

– Калі ласка, сусед, на сняданак!

Пра сняданак ён, вядома, жартуе, бо добра ведае, што даўгавухі прыйдзе на папаску толькі пасля захаду сонца.

Юлій Ванаг

?

1. Хто герой гэтага апавядання?
2. Чым ён займаецца?
3. Як Міхась дапамагае звярам?
4. Пра што расказваюць сляды на снезе?

**Пад націскам гукі е, ё вымаўляюцца заўсёды выразна. Пры пераходзе націску на наступны склад гукі е, ё пераходзяць у я – яканне.**

**лён – лянок дзень – дзянёк цень – цяністы**

**1.** Змяні словы так, каб замест **е**, **ё** можна было напісаць **я**:

**лёд, след, мёд, цвёрды, снег, спеў, легчы, вёз, вецер.**

**2.** Спішы словы. У пустыя месцы ўстаў прапушчаныя літары:

**вос...нь, гн...здо, цв...рды, з...мля, з...лёны, с...стра, п...ць, пал...ц, л...сны, с...мнаццаць, мал...ваць, ц...жкі, пав...тра, м...сцовасць, св...тло.**

# Тэмы:

1. Песня «Снег не ідзе».
2. Люты.
3. Аглушэнне зычных.
4. Цікавінкі.
5. Космас.
6. Касмічны карабель.
7. Месяц.
8. Сінонімы.
9. Вопратка і абутак.
10. Азванчэнне зычных.

## Вывучы словы песні

**Андрэй Хадановіч**

# Снег не ідзе



Хіба на вечар той можна забыцца?
Жухлае лісце, сухаяігліца.
Ані бялюткае плямы нідзе.
Снег не ідзе.

Вось памяркоўны клімат пракляты!
Як жа без горкі дзятве на Каляды?
Як дываны выбіваць грамадзе?
Снег не ідзе.

Лічаць гадзіны, чакаючы даты,
бард валасаты, мысляр барадаты.
Горкія слёзы ў яго барадзе –
снег не ідзе!



Просіць паэт, падбіраючы словы,
і рыбаловы губляюць галовы:
нехта з адчаю пайшоў па вадзе…
Снег не ідзе.

Просяць дарослыя і падшыванцы.
Просіць палітык на добрай
трасянцы:
“Дзеткам – па зорачцы,
нам – па звяздзе…”
Снег не ідзе.

Не сумнявайцеся, мірныя людзі!
Цуд на Каляды… калісьці, ды будзе:
выйдзеш увесну, а там, як на грэх,
снегу да стрэх!

**Міра Лукша**

# Люты



Месяц люты як лютуе –
снегам дзьме, насы марозіць,
шыбы ў срэбны ліст малюе,
зімку-паню ў санях возіць,
а ад бомаў яго коней
дрыжыкі бягуць па спінцы:
Бомы дзынькаюць і звоняць,
а ў пуховае пярынцы
спіць зямля, і не прачнецца,
пакуль сонца не пагрэе,
месяц Сакавік пачнецца,
месяц Люты пасівее
і паедзе з маразамі зноў
адкуль прыходзіць.
Дык нацешмася мы з вамі
у зімовым карагодзе.

?

1. Чым займаецца Люты паводле паэткі Міры Лукшы?
2. Як разумееш фразу «месяц Люты пасівее»?
3. Да чаго заахвочвае чытача аўтарка верша?
4. Апішы сённяшняе надвор’е.



**Зычныя гукі вымаўляюцца не аднолькава.
У беларускай мове маем звонкія зычныя
(б, в, г, д, дж, дз, ж, з, л, м, н, р)
і глухія зычныя (к, п, с, т, ф, х, ц, ч, ш).**

Некаторыя звонкія зычныя маюць адпаведныя глухія, утвараюць пары: **б – п, г – х, д – т, дж – ч, дз – ц, ж – ш, з – с**.

**1.** Прачытай пары слоў. Звярні ўвагу на вымаўленне выдзеленых літар.

**біў – піў**
**год – ход**
**дата – тата**
**дзік – цвік**
**жар – шар**
**заліў – саліў**

**2.** Параўнай вымаўленне выдзеленых літар у ніжэй прыведзеных парах слоў.

ро**д** – ро**т**
гры**б** – гры**п**
мола**дзь** – кало**ць**
ра**з** – ры**с**
кры**ж** – мы**ш**
Лі**дк**а – Лі**д**а
ка**з**ка – ка**з**ачнік
сце**ж**ка – сця**ж**ынка
лу**г** – і**х**
клю**ч** – дож**дж**

Звонкія зычныя **б, г, д, дж, дз, ж, з,** калі стаяць на канцы слова або перад глухімі зычнымі, вымаўляюцца як адпаведныя ім глухія. Гэта **аглушэнне звонкіх зычных.**

**3.** Змяні словы так, каб пасля выдзеленых зычных стаяў галосны гук або зычныя **в**, **л**, **м**, **н**:

гры**б** – грыбны
лё**д** – .....
яга**д**ка – .....
ця**ж**кі – .....
сту**ж**ка – .....
ду**б** – .....
маро**з** – .....
гла**д**кі – .....
бера**г** – .....
наро**д** – .....

# Для цікавых...

Клеткі крыві чалавека абнаўляюцца кожныя некалькі месяцаў, клеткі скуры – кожныя некалькі тыдняў. Таму, калі абдзерціся, на пашкоджаным месцы пасля ўтворыцца струп. Праз некалькі тыдняў ён падсохне і адваліцца, а пад ім будзе новая ружовая скура. А вось клеткі мозга не змяняюцца на працягу ўсяго жыцця чалавека. Якраз гэта дазваляе нам памятаць што-небудзь да самай смерці.

Амаль усе дзеці нараджаюцца з блакітнымі вачыма. У некаторых вочы так і застаюцца блакітнымі назаўсёды. У іншых жа змяняюць свой колер, калі немаўлятам спаўняецца некалькі месяцаў – робяцца карымі, шэрымі ці зялёнымі.

Клеткі лёгкіх усмоктваюць з крыві лішнюю для арганізма колькасць вады. Яна выводзіцца з яго пры выдыханні разам з паветрам. У гэтым лёгка пераканацца, калі падысці да акна ці люстэрка і з сілай выдыхнуць на шкло паветра. Шкло адразу запацее. Варта правесці па ім пальцам, каб заўважыць, што яно стала вільготным. Гэта і ёсць тая самая вада. Дык вось цікава, што дзіця выдыхае кожны дзень каля дзвюх шклянак вады, а дарослы чалавек – амаль чатыры.

Даўжэй за ўсіх без вады могуць абыходзіцца некаторыя віды павукоў: каля года. Гэта абсалютны рэкорд, да якога вельмі далёка такім жывёлам як вярблюд, антылопа і жыраф. Вярблюд, напрыклад, можа абыходзіцца без кроплі вільгаці на працягу двух тыдняў, але пры гэтым страчвае амаль трэць вагі. У экстрэмальных умовах вярблюд жыве без вады і 45 дзён.

Буслянка 4, 1998

**1.** Якая інфармацыя зацікавіла цябе найбольш? Чаму?

# Выходзім у адкрыты космас

Мы жывем на планеце Зямля. Зямля разам з іншымі планетамі – Меркурыем, Венерай, Марсам, Юпітарам, Сатурнам, Уранам, Нептунам – круціцца вакол Сонца. Усе разам яны ўтвараюць Сонечную сістэму.

Такім чынам, Зямля – спадарожнік Сонца. У Зямлі таксама ёсць спадарожнік – Месяц. Нават без тэлескопа можна разгледзець яго паверхню. Тыя плямы, якія здаюцца морамі, насамрэч – раўніны. На Месяцы няма вады, няма паветра і жыцця. Тэмпература там невыносная для чалавека: ад мінус 170°C уначы да плюс 130°C удзень! Неба чорнае нават удзень, бо няма атмасферы, якая б стварала цудоўны блакітны колер, як у нашага неба.

Яшчэ на Месяцы ёсць кратары розных памераў – ад некалькіх метраў да дзясяткаў кіламетраў. Гэта яміны, што засталіся ад падзення астэроідаў і метэарытаў. Некаторыя з іх носяць прозвішчы вядомых навукоўцаў, якія нарадзіліся ў Беларусі: Пачобут, Цэраскі, Ціхаў.

У розныя дні зямны спадарожнік неаднолькава бачны з Зямлі. Нашы продкі называлі Месяц у залежнасці ад «квадры» – перыяду яго бачнасці. Маладзік – малады Месяц, падобны да сярпа. Поўня



– круглая, поўная. Сход – паўкруг. Ветах – таксама серп, але выгінаецца ўжо ў іншы бок (нібы літара С).

У ясны месяцовы вечар паглядзі на зорнае неба. Ты ўбачыш мноства зорак, сярод якіх ёсць і вельмі яркія, і амаль нябачныя. Некаторыя з іх людзі аб'ядналі ўяўнымі лініямі і назвалі сузор'ямі. Усе сузор'і маюць назвы, напрыклад: Вялікая Мядзведзіца, Малая Мядзведзіца, Блізняты, Цялец, Дэльфін, Рыбы... А выразная белая паласа на цёмным небе – гэта Млечны Шлях (назва, якая прыйшла да нас ад старажытных грэкаў). Беларусы называлі яго Птушынай Дарогай. Продкі верылі, нібыта душы памерлых робяцца птушкамі і па гэтай зорнай дарозе адлятаюць у вырай.

Самая яркая зорка ў сузор'і Малой Мядзведзіцы добра вядомая заўзятым турыстам. Ад іншых зорак яна адрозніваецца тым, што не змяняе свайго месца на небе. Палярная зорка заўжды паказвае на поўнач. Калі ты станеш да яе тварам, спераду ў цябе будзе поўнач, ззаду – поўдзень, злева – захад, а справа – усход. Запомні гэта, і ты не заблукаеш у падарожжы нават без компаса.

Гражына Арсайла

**1.** Запішы назвы ўсіх планет Сонечнай сістэмы.
**2.** Як называюць Месяц у розныя перыяды яго бачнасці?
**3.** Якія сузор'і названыя ў тэксце?
**4.** У чым дапамагае турыстам Палярная зорка?



# На касмічным караблі

Сённяшнія хлапчукі заўзята гуляюць у касманаўтаў. Мараць лятаць у космас, быць камандзірамі караблёў. А кожны касмічны палёт – гэта перш за ўсё праца, праца цяжкая, упартая, адказная.

Вядома, прафесія наша цікавая. З касмічнай вышыні добра відаць, што Зямля круглая. Такое можна ўбачыць толькі з космасу! І выглядае яна блакітнай.

Неба ў космасе, наадварот, не блакітнае, а чорнае. Зоркі на ім ярка-белыя, буйныя. Здаецца, вісяць яны так нізка над галавой, што можна дакрануцца да іх рукамі.

Сонца таксама выглядае не так, як з Зямлі. Яно нязвычна вялізнае, вельмі зыркае, ажно белае. У час заходу сонца робіцца чырвоным, яно сплюшчваецца ў палоску. І ўзыходзіць вельмі прыгожа. У тым месцы, дзе яно павінна выкаціцца з-за гарызонту, успыхвае колерны акаём, які пераліваецца, як вясёлка.

Вельмі ўражае тое, што Зямля з космасу выглядае не такой ужо і вялікай. Я нарадзіўся і жыў пад Брэстам. І некалі са страхам думаў: колькі гэта дзён трэба ехаць ад Брэста да Уладзівастока цягніком! А на караблі мы праляталі гэту адлегласць за дваццаць мінут.



Але мы лятаем у космас працаваць. Вынікаў кожнага касмічнага палёту з нецярпеннем чакаюць вучоныя.

Да палёту касманаўты настойліва і доўга рыхтуюцца. Якраз таму хочацца яшчэ раз падкрэсліць: самае галоўнае ў прафесіі касманаўта – праца. І ў дадатак – моцнае здароўе!

Жыць і працаваць у космасе нялёгка. Там усё траціць вагу. Бачыш, што ў цябе рукі і ногі на месцы, але іх ты не адчуваеш. Падымаеш руку, а ніякай сілы на гэта не трэба. Ледзь паварушыўся ў крэсле – і ты «плаваеш» па кабіне. Хадзіць ці бегаць у космасе немагчыма: ногі адрываюцца ад «падлогі».

Спаць можна толькі ў спальным мяшку, які прывязаны да борта карабля. Ды трэба і самога сябе прывязваць да мяшка. Бо спрасонку можна выплыць і прачнуцца далёка ад свайго спальнага месца.

З'есці што-небудзь у космасе ці папіць вады – таксама работа. Боршч альбо суп знаходзяцца ў алюмініевых тубах, якія падобны да цюбікаў ад зубной пасты. Знішчаеш каўпачок, праколваеш кончыкам нажа дзірку. Пасля злёгку націскай на тубу і смакчы.

Хлеб упакаваны ў пакеты. Буханачка – малюсенькая, з палову запалкавага карабка, каб яе можна было зараз укінуць у рот.

Адным словам, жыць у космасе складана, а працаваць вельмі адказна.

Пятро Клімук

**1.** Што цябе найбольш уразіла ў працы касманаўта?

**2.** Як ты выхоўваеш у сабе працавітасць?





# Чаму месяц без вопраткі ходзіць?



Захацеў неяк месяц пашыць сабе ўбранне. Пайшоў да краўца. Зняў кравец з яго меркі.

– Прыходзь, – кажа, – праз тыдзень.

Мінуў тыдзень. Прымярае месяц адзенне. Ды дзе там яно яму! Вузкае, цеснае. «Відаць, памыліўся», – падумаў кравец. І зноў кажа месяцу:

– Прыходзь праз тыдзень.

Пашыў кравец. Сядзіць, чакае. Аж тут коціцца па небе месяц. Круглы, вялікі. Тут і без прымеркі відаць: вопратка будзе малая.

Разгубіўся кравец і кажа:

– Не магу табе, месяц, убранне пашыць. То ты як сярпок. То ў палавіне. А цяпер у поўні. Ніколі не будзе табе ўбранне якраз.

Так і застаўся месяц без вопраткі.

Анатоль Клышка

**1.** Адкажы на пытанне з загалоўка тэксту.

**2.** Знайдзі ў тэксце словы з ў (нескладовым). Запішы іх. Растлумач правапіс.

**3.** Што шыў кравец?

**Словы з блізкім ці аднолькавым значэннем называем сінонімамі.**
**Напрыклад: убранне, адзенне, вопратка.**

**4.** З прыведзеных ніжэй моўных адзінак падбяры сінонімы да слоў: смутак, старанны, упасці, гаварыць.

**размаўляць, шлёпнуцца, руплівы, маркота, балбатаць, туга, дбайны, нэндза, распластацца, грымнуцца, гаманіць, маркота, трапаць языком, выцягнуцца, бурчэць, шаптаць, журба**

**5.** Падбяры сінонімы да слоў: ісці, крычаць, прыязны, вялікі, дом.

# Вопратка і абутак




паліто
шапка
капялюш
касцюм
кашуля
блуза
куртка
майка
гальштук
камізэлька
нагавіцы
чаравікі
красоўкі
кеды
кепка

**1.** Якія прадметы гардэроба спатрэбяцца табе ў наступных сітуацыях:

| у школе | на дыскатэцы | на летніку |
|---|---|---|
| ..... | ..... | ..... |
| ..... | ..... | ..... |
| ..... | ..... | ..... |
| ...... | ..... | ...... |

| у тэатры | на Каляды | на экскурсіі |
|---|---|---|
| ..... | ..... | ..... |
| ..... | ..... | ..... |
| ..... | ..... | ..... |
| ...... | ..... | ...... |

**Глухія зычныя перад звонкімі зычнымі ў сярэдзіне слова вымаўляюцца звонка. Гэта азванчэнне зычных.**

**2.** Змяні словы так, каб пасля выдзеленых зычных стаяў галосны гук.

касьба – касіць
просьба – .....
барацьба – .....

малацьба – .....
лічба – .....
носьбіт – .....

**3.** Складзі сказы са словамі:

просьба, барацьба, дзядзька, паводка.

## Тэмы:

1. Родная мова.
2. Адукацыя.
3. Мой народ.
4. Родная зямля.
5. Род і лік прыметнікаў.
6. Мая маленькая айчына.
7. Я — беларус.
8. Усяслаў Чарадзей.
9. Антонімы.
10. Песня «Бусел».

# Шануй сваю мову

Чалавечая мова – гэта як вялікі стары таямнічы бор, поўны жыцця, поўны звонкіх спеваў, нязнаных вясёлых і страшных шэптаў, поўны радасці і смутку. Ёсць у чалавечай мове словы моцныя і велічныя, як дубы, што ўзносяцца ў неба: **мужнасць, герой**; ёсць словы вясёлыя, як **сонца, песня**; ёсць словы, якія звоняць нібы жаўранкі ў блакіце вясновага ранку, альбо скардзяцца, як **енк**.

Паглядзіце, як гэта цікава: некаторыя словы самім сваім гучаннем, як бы пераймаюць тое, што выказваюць, напрыклад: **рык, гром, свіст, сык, гук**.

Дык будзем з замілаваннем услухоўвацца ў нашу мову і будзем старацца як найлепш карыстацца ёю.

Памылка ў мове – гэта як брыдкая тлустая пляма на фатаграфіі маці, якую любіш; гэта як нестаранна прышытая латка на ўбранні, у якім ідзеш у госці. Дрэнна гаварыць альбо пісаць – гэта значыць крыўдзіць сваёю моваю ўсіх тых, хто з такім намаганнем яе будаваў. Мова смуткуе, хварэе, калі людзі ёю кепска гавораць.

Януш Корчак

1. Назаві словы, якія Януш Корчак лічыць моцнымі і велічнымі?
2. Якія словы паводле аўтара вясёлыя?
3. Якім словам перадаецца незадавальненне або скарга?
4. Да чаго педагог параўноўвае памылку ў мове?



# Родная мова

Здарылася так, што людзі аднаго краю палічылі быццам мова, якою гаварылі іх бацькі, дзяды і прадзеды, непрыгожая.

– І чаму, – абураліся адны, – у нас «р» толькі цвёрдае, а ў суседзяў ёсць і мяккае?

– Так, так, – згаджаліся другія, – у суседзяў «г» гучнае, а ў нас – амаль як «х».

Што ж рабіць?

Думалі, думалі і надумалі ўрэшце пазычыць мову ў суседзяў. Яна, маўляў, і багацейшая, і прыгажэйшая. Хоць і вельмі блізкая да тутэйшай. І пазычылі. І ніякіх быццам складанасцей. Многія ж словы аднолькава ў абедзвюх мовах гучалі. Такія важныя і патрэбныя, напрыклад, як «хлеб», «соль», «мір», «дом», «поле», «лес»...

Але былі і несупадзенні, праз якія здараліся розныя недарэчнасці. Часам смешныя, а часам і не надта смешныя.

Справа ў тым, што ў абедзвюх мовах адны і тыя ж словы гучалі аднолькава, але мелі розны сэнс.

І зноў задумаліся людзі. Што рабіць? Пайшлі да самага старога і разумнага ў той краіне чалавека. Спыталіся. А самы разумны чалавек і кажа:



– Кожны народ сваю мову мае. Кожнаму народу яна – родная. І не шанаваць, не любіць яе – тое самае, што выракацца маці і бацькі, той зямлі, дзе мы нарадзіліся, якую родным краем завём. Адно магу вам параіць: шануйце мову родную і суседскую паважайце...

Паслухалі людзі самага старога ды самага разумнага чалавека. І неўзабаве зразумелі, што ні адной на свеце мовай не выкажаш так дакладна свае думкі і пачуцці, як роднай. І яшчэ ўпэўніліся, што дарма ганілі яе. І багатая яна, і мілагучная. Не горшая за суседскую і за ўсе іншыя мовы.

Вось і вырашылі тутэйшыя людзі змалку дзяцей сваёй мове вучыць. А хто яшчэ другую, і трэцюю, і чацвёртую ведаць пажадае, калі ласка! Вучы. Старайся. Ад гэтага толькі карысць. І сабе. І людзям. І роднаму краю.

Вось так...

Слова за словам –
і казкам канец,
хто зразумеў іх –
той маладзец!

паводле Артура Вольскага

?

1. Пра што ты даведаўся / даведалася з казкі?
2. Якія мовы ты вывучаеш у школе?
3. Чаму ты навучыўся на ўроках беларускай мовы?

**Адукацыя гэта працэс і вынік набыцця ведаў.**
**Яслі, дзіцячы садок, пачатковая школа, ліцэй, тэхнікум, універсітэт**
**Вучыць каго? чаму?** *Вучыць дзяцей беларускай мове.*
**Вучыць што?** *Вучыць верш на памяць.*
**Вучыцца чаму?** *Ён вучыцца музыцы.*
**Навучацца на каго?** *Навучацца на настаўніцу беларускай мовы.*
**Хатняе заданне**
**Ацэнка / адзнака**

Алесь Ставер

# Мой народ

Мой народ праз стагоддзі пранёс дабрату,
Да суседзяў-народаў павагу.
Знае свет навакольны яго прамату,
І любоў да жыцця, і адвагу.

І заўсёды ў віхурах вякоў і нягод,
У зямной непагодзе суровай,
Вылучыла між іншых мой мужны народ
Беларуская родная мова.

Мой народ зберагае сваю даўніну.
Кожны нашай гісторыі знаўца
Добрым словам успомніць не раз Скарыну
І пахваліць за мудрасць Мсціслаўца.

Каліноўскага імя навокал гучыць,
І Купалы і Коласа слова, –
Навучыла іх край беларускі любіць
Беларуская родная мова.

Дык чаруй жа людзей паміж моваў другіх
І гучы вечна ярка і нова,
Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх –
Беларуская родная мова!



1. Якія рысы характару беларускага народа адзначае паэт? Прачытай радкі.
2. Як ты разумееш выраз «мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх»?
3. Якое самае запаветнае жаданне паэта?



# Родная зямля

Любоў да радзімы ў чалавека асабліва яскрава праяўляецца тады, калі ён разлучыцца з ёю. І чым даўжэй ён будзе недзе далёка, тым мацней гэта пачуццё. А вось у птушак усё гэта навідавоку.

Возьмем усім нам знаёмых жораваў. На радзіме яны, апрача глухога балота з іржавай вадой ды драбналесся, нічога, бадай, за сямейнымі клопатамі не бачаць. У далёкіх жа краях птушак чакае багаты корм, залітыя паўднёвым сонцам берагі маляўнічых рэк і азёр. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, восенню пакідаюць жоравы радзіму вельмі неахвотна.

Паволі пралятаюць над вёскамі і пустымі палямі, яны разпораз падаюць свае сумныя галасы – цяжка з роднай зямлёй развітацца. А то, не ўтрымаўшыся, парушаць свой падарожны строй і закружацца на месцы, углядаючыся з вышыні ў мілыя сэрцу краявіды. Потым сяк-так зноў выстраяцца, сумна курлычучы, пацягнуць удалячынь.

Неахвотна пакідаюць родную зямлю не адны жоравы. Гэта ўласціва ўсім птушкам.

Вясной гракі з'яўляюцца ў нас з першымі праталінамі ў палях. Затое пакідаюць родную зямлю толькі позняй восенню, нярэдка ўжо з першым зазімкам, які зацерушыў белым пухам чорную асеннюю зямлю. Паглядзіце тады на чараду запозненых птушак, што нізка сцелецца над пабеленай зямлёй, і так раптам сэрца зашчаміць у грудзях.

Позна адлятаюць качкі. А пры зручным выпадку і зусім застаюцца зімаваць. Была б толькі палонка, якая б не замярзала зімой, дзе можна такі-сякі корм здабыць.

У канцы кастрычніка – пачатку лістапада надвячоркам і ранічкаю можна пачуць у змрочным лесе знаёмую песеньку заранкі. Гэта азначае, што чырванагрудая птушачка яшчэ тут, не пакінула галодны аголены лес.

Родная зямля! Што можа быць даражэй за яе!

Рыгор Ігнаценка

?

1. Якія пачуцці выклікае ў цябе гэты тэкст?
2. Знайдзі і прачытай урыўкі, дзе расказваецца аб тым, як пакідаюць радзіму жоравы, гракі.
3. Як разумееш выраз: «І так раптам сэрца зашчыміць у грудзях»?
4. Знайдзі ў тэксце словы, у якіх падкрэсліваецца нежаданне птушак пакідаць радзіму.
5. Зрабіце (у групах) малюнкі да апавядання. Падпішыце іх словамі з тэксту.

**Словы, якія абазначаюць якасці і прыметы прадметаў і адказваюць на пытанні: які?, якая?, якое?, якія?, або чый?, чыя?, чыё?, чые? гэта прыметнікі.**
**(*родная* мова, *добры* хлопец, *жытняе* поле, *маміна* сукенка)**
**Прыметнікі ў сказе паясняюць назоўнікі і ставяцца ў тым жа родзе, склоне і ліку, у якім стаяць паясняемыя імі назоўнікі.**
**Прыметнікі змяняюцца па родах, склонах, ліках.**

**1.** Дапішы прыметнікі да назоўнікаў:

..... школа
..... пер'е
..... сонца
..... дзеці,
..... дрэва
..... мова
..... народ
..... радзіма
..... сакавік
..... вясна

**2.** Падбяры назоўнікі да прыметнікаў:

драўляны .....
жоўты .....
доўгі .....
каляровы .....
прыгожая .....
шакаладная .....
чорная .....
папяровая .....
малое .....
цёмнае .....
цяжкае .....
салодкае .....

Вывучы словы песні

**Віктар Швед**

# Мая маленькая айчына

Мая маленькая айчына,
Мой беластоцкі родны край,
Тут басанож стаптаў сцяжыны,
Што праляглі праз поле, гай.

Цаніць тут навучыўся працу,
Гамонку шчырую, народ.
І не магу цябе я страціць,
Ты –даражэйшая штогод.

Далёка ад цябе – сумую.
Убачу – дык шчаслівы зноў.
У сэрцы заўсягды нашу я
Крыніцу мар маіх і сноў.

Мая маленькая айчына,
Я твой аддданы верны сын.
Цябе ніколі не пакіну,
Мая калыска, мой спачын.


фота Вальдэмар Квяткоўскі

Сяргей Законнікаў

# Я – беларус

Я – беларус. Спрадвеку мне належыць
Чароўны край
палёў,
бароў,
крыніц.
Ад тураўскіх муроў да Белавежы,
Ад Крэва і да полацкіх званіц.
Крывіч,
радзіміч,
дрыгавіч
у згодзе,
Дапамаглі мне моцным верай стаць,
Каб прарастаў,
як колас,
у народзе,
Які ніхто не зможа растаптаць.
Каб моваю душа мая світала,
Каб быў я варты матчынай зямлі,
Скарына,
Каліноўскі
і Купала
Свой горды дух і мне перадалі.

Я – беларус. Я ведаю сягоння,
Як пракладаць да шчасця вольны шлях.
Са мною – наўміручая Пагоня
І бел-чырвона-белы родны Сцяг!



**Крывічы, дрыгавічы, радзімічы** – даўнейшыя плямёны, з якіх утварыўся беларускі народ.

**Васіль Жуковіч**

# Усяслаў Чарадзей



Не легенда і не казка –
праўда з даўніны ідзе:
князем Полацкага княства
быў славуты Чарадзей –
легендарны Усяслаў
(пры жыцці легендай стаў).

Слава князю Усяславу:
мацаваў сваю дзяржаву
той, хто з роду крывічоў;
слава князю Чарадзею:
ён перамагаў зладзеяў,
што паўзлі з усіх бакоў.

Паважалі Усяслава
і свае, і чужакі:
хто – за розум,
хто – за славу,
хто – за сілу, –
свет такі.

Слава князю Чарадзею:
быў ён верай дабрадзеям,
злыдням волі не даваў,
княства так любіў заўсёды,
як жыццё і як свабоду,
пра яго да скону дбаў.

1. Кім быў Усяслаў Чарадзей?
2. Якой краінай ён уладарыў?
3. Якім уладаром быў Усяслаў?
4. За што паважалі князя?



**Словы з супрацьлеглым значэннем называюцца антонімамі.**
**(худы – тоўсты, салодкая – горкая)**

1. Падбяры антонімы да слоў:

**здароўе – .....**
**працаваць – .....**
**усход – .....**
**вясёлая – .....**
**лёгкі – .....**
**моцны – .....**
**поўдзень – .....**
**праўда – .....**
**шырокая – .....**
**левае – .....**

**вялікі – .....**
**чысты – .....**
**цеплыня – .....**
**прыгожы – .....**
**сказаць – .....**
**працавіты – .....**
**нізкі – .....**
**канец – .....**
**вялікае – .....**
**блізка – .....**

2. Складзі сказы са словамі:

**багаты, бедны, доўгі, кароткі, добрая, дрэнная, дзень, ноч.**

## Вывучы словы песні

**Леанід Дранько-Майсюк**

# Песенька патрыятычнага Бусла




Кожны ведае, што Бусел
З галавы да брушка
Сімвал роднай Беларусі –
Вось якая птушка!
І яе шануюць людзі
З любасцю найсамай...
Тых людзей, якія любяць,
Я люблю таксама.

Прыпеў:

У народзе-агародзе
Чаўпата чаўпецца,
А ў прыпеўцы гарадзецкай
Пра мяне пяецца:
“Буськo-клечко,
Знясі мне яечко,
І не белэе, ні тэ,
А яечко золотэ!..”

Кожны бацькаўшчыну славіць,
Калі зразумее:
На чужыне сонца паліць,
На радзіме грэе!
На Палессі ў родным полі,
У балоце родным
Так ці гэтак, а ніколі
Я не быў галодным!

Прыпеў:

У народзе-агародзе...

Да цяпла ляцеці мусіш,
Да чужога лета.
Добра там... На Беларусі ж
Усё роўна лепей!
Тут усё пяе-клякоча;
Тут на жабе жабка;
Тут дзяўчыне, як захоча,
Прынясу дзіцятка!

Прыпеў:

У народзе-агародзе...

## Тэмы:

1. Надыход вясны.
2. Веснавая прырода.
3. Хто дужэйшы?
4. Скланенне прыметнікаў.
5. Ветлівыя словы.
6. Велікодная паштоўка.
7. Час дзеяслова.
8. Як прыйшла да нас кніга.
9. Беражыце сшыткі, кніжкі.
10. Песня «Сонца нам дапаможа».

# Зіма-падманшчыца
## (Казка)

Прыляцела белагрудая з вілаватым хвосцікам ластаўка, прынесла першую вестку пра вясну. Усе ўзрадаваліся...

Зайцы саромеліся сваёй вопраткі. Іх белыя кажушкі выліналі, былі брудныя. Яны нікому не маглі паказацца на вочы.

Мядзведзі, якія ўсю зіму праспалі ў сваіх бярлогах, схуднелі, бедалагі, і аслабелі.

Вераб'і цвыркалі і то пераскаквалі з галіны на галіну, што ўкрыліся бухматымі пупышкамі, то корпаліся ў зямлі, снег на якой зусім растаў.

Усе падумалі, што прыйшла сапраўдная Вясна, і зарадаваліся, пачалі віншаваць адзін аднаго. Але было неяк дзіўна, не адчувалася вясенняга цяпла. Ды і ўсмешка ў Вясны была нейкая незвычайная. Калі б прыйшла сапраўдная Вясна, яна прынесла б зайцам шэрае футра; мядзведзі не спалі б у бярлогах, а грэліся б на сонейку, набіраліся сілы; у вераб'ёў ужо нарадзіліся б малыя дзіцянятк і; дрэвы атрымалі б новае ўбранне, а кветкі і трава паказаліся б на белы свет.

Вішня і Алыча сказалі кветкам і лісцікам, каб яны не спяшаліся, пачакалі трохі – нешта вельмі халоднае дыханне ў гэтай Вясны. Лісцікі спалохаліся, а ўпартыя кветкі не паслухаліся Вішні і Алычы: расхінулі свае зялёныя кашулькі, расплюшчылі вочкі і пацягнуліся да сонейка. Яны былі такія шчаслівыя!

Старая Зіма-падманшчыца зларадна заўхмылялася: «Бач ты, як яны ўсе зарадаваліся. Ну, пачакайце, зараз я вам пакажу Вясну!»

Яна скінула зялёнае адзенне і вянок, наслала на ўсё жывое вецер, ураган, мароз і снег.

Паляцелі прэч птушкі, пахаваліся звяры. Толькі кветкам і траве не было дзе схавацца. Зіма сарвала кволыя пялёсткі, замарозіла, высушыла іх. Але час зімы ўжо мінуў. Падманшчыца зусім знясілела. Губляючы сваю ўладу над прыродай, яна пачала адпаўзаць у горы.

А сапраўдная Вясна ўжо ішла па зямлі, надзеўшы духмянае ўбранне з маладой зялёнай травы і вянок з самых прыгожых кветак.

**Залатыя промні сонца рассыпаліся на яе плячах. Яе непераможную хаду ўжо ніхто не мог спыніць і затрымаць.**

**Добры дзень, маладая, прыгожая, жаданая Вясна!**

Азіза Ахмедава

?

1. Як выглядалі зайцы, мядзведзі і вераб'і пасля зімы?
2. Чаму аўтарка казкі называе Зіму падманшчыцай?
3. Што Зіма наслала на ўсё жывое?
4. Як выглядае сапраўдная Вясна?
5. Назаві прыкметы вясны?
6. Выпішы з тэксту ўсе прыметнікі. Вызначы іх род.



# Калі пачынаецца вясна

– Калі пачынаецца вясна? – пытаўся я ў нашага дзеда Міхала. Ён усё ведаў.

– Вясна пачынаецца тады, – гаварыў дзед, – калі шчупак хвастом расколе лёд у рэчцы, калі забушуе крыгалом, калі вада падыдзе да нашага агарода.

Вада падыходзіла да саменькага агарода, а вясны не было. Холадна...

– Калі пачнецца вясна?

– А тады, калі з кляновай галінкі закапае сок у збанок.

Я надрэзаў кляновую галінку, капаў сок у збанок, а вясны не было. Холадна...

– Калі пачнецца вясна?

– Бусел на крыле прынясе вясну з цёплага краю.

Прыляцелі буслы, не прынеслі вясны. Холадна...

– Калі пачнецца вясна?

– А тады, калі зязюля закуе ў бары, калі на елках маладыя шышкі стануць такія чырвоныя, як грабеньчыкі ў пеўняў.

Закукавала зязюля, смалою-жывіцай, карою запахлі хвоі ў цёмным бары. Маладыя шышкі на елках пачырванелі, заіскрыліся, як у пеўняў грабеньчыкі. Вясёлыя іскрынкі ўпалі на траву, падскочыла ад радасці трава, а ў траве засінелі, зачырванелі, заружавелі краскі. Цеплынёю, мядовым водарам дыхнулі мне ў твар тыя лугавыя краскі. І тады я зразумеў: з шэрай зязюлі, з яе самотнага голасу, з чырвоных маладых яловых шышак пачынаецца цёплая вясна...

Вясна-красна на ўвесь свет!

Антон Бялевіч

1. Адкажы, калі пачынаецца вясна?
2. Запішы адказ у сшытку.



Змітрок Бядуля

# Вясна



То не снег,
То чаромха цвіце.
То не снег,
То бярозка расце.

То не снег –
Расцвітае садок.
То не снег,
А ляціць матылёк.

То не шоўк –
Гэта рунь ля гары.
То не шоўк,
А сон-цвет у бары.

То не шоўк,
А мурожны лужок,
То не шоўк –
Маладзенькі лянок.

Не гусляр –
То пяюць салаўі.
Не гусляр –
То звіняць ручаі.

Не гусляр –
Дрозд у гаі пяе.
Не гусляр –
Гэта пчолка гудзе.

Ах, вясна
Маладая мая!
Пад табой
Ажывае зямля.

Пад табой
І звініць і пяе
Нават жук...
Нават мушка ў траве.



1. Які настрой перадаў паэт у вершы?
2. Якія прыметы ў прыродзе сведчаць пра надыход вясны? Прачытай, як пра гэта гаворыць аўтар.





Кастусь Цвірка

# Спрэчка звяроў

Заспрачаліся звяры:
– Хто дужэйшы у бары?
– Я! – ускочыў зайка з куста
і падняў качан капусты.
– Я! – вявёрка адказала. –
Я не гэта падымала.
– Я дужэйшая, сястрыца, –
умяшалася лісіца. –
Я ўначы праз лес вялікі
несла з вёскі аж індыка!
І не слухалі звяры:
– Я – дужэйшая ўдвая!



– Не, няпраўда – я! Я! Я!
Так раўлі яны – аж змоклі,
ды раптоўна ўсе замоўклі.
Між травы якраз памалу
тут мурашка прапаўзала.
На спіне без крыку й гулу
доўгі сук яна цягнула.

Ну, а ён – няма цяжэй –
за яе ў сем раз даўжэй!
Тут звяроў такі ўзяў сорам –
хоць вазьмі залазь у норы!
Неўпрыкметку разышліся
і дадому падаліся.
І ніколі з той пары
не спрачаюцца звяры.

?

1. Чаму стала сорамна выхваляцца звярам?
2. Дай назвы часткам твора.
3. Якое павучэнне для сябе ты вычытаў / вычытала у вершы?



# Скланенне прыметніка

**Склон прыметніка залежыць ад склону назоўніка.**

**Назоўны**

***які?*** цёплы дзень
***якая?*** цёплая вясна
***якое?*** цёплае надвор'е

**Родны**

***якога?*** цёплага дня
***якой?*** цёплай вясны
***якога?*** цёплага надвор'я

**Давальны**

***якому?*** цёпламу дню
***якой?*** цёплай вясне
***якому?*** цёпламу надвор'ю

**Вінавальны**

***які?*** цёплы дзень
***якую?*** цёплую вясну
***якое?*** цёплае надвор'е

**Творны**

***якім?*** цёплым днём
***якой?*** цёплай вясной (вясною)
***якім?*** цёплым надвор'ем

**Месны**

***аб якім?*** цёплым дні
***аб якой?*** цёплай вясне
***аб якім?*** цёплым надвор'і

**1.** Падбяры прыметнікі да назоўнікаў:

| | | |
|---|---|---|
| ..... кветка | ..... луг | ..... поле |
| на ..... полі | на ..... гары | пры ..... дарозе |
| пад ..... крэслам | аб ..... дзяўчыне | за ..... акном |
| ..... дошцы | з ..... сябрам | у ..... кніжцы |

**2.** Пастаў прыметнік у адпаведным склоне.

Ужо цвітуць ..... кветкі. Над імі кружаць ..... матылі і шчыруюць ..... пчолы. Птушкі будуюць ..... гнёзды. Побач ..... школы растуць ..... ліпы.

**3.** Праскланяй прыметнікі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Н. | цёмны, | зялёная, | белае |
| Р. | ....., | ....., | ..... |
| Д. | ....., | ....., | ..... |
| В. | ....., | ....., | ..... |
| Т. | ....., | ....., | ..... |
| М. | ....., | ....., | ..... . |

**4.** Да назоўнікаў падбяры прыметнікі.

| | | |
|---|---|---|
| настаўніца | ***якая?*** | ....., ....., ..... |
| зімой | ***якой?*** | ....., ....., ..... |
| коціку | ***якому?*** | ....., ....., ..... |
| лесу | ***якога?*** | ....., ....., ..... |
| адзенне | ***якое?*** | ....., ....., ..... |
| камп’ютар | ***які?*** | ....., ....., ..... |

Пятрусь Броўка

# Калі ласка!

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: «Калі ласка!..»
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
– Калі ласка, калі ласка ў хату!
Гром грыміць. З нябёсамі размова:
– Калі ласка, цёплы дождж вясновы!
І не вельмі буйны і не рэдкі –
На сады, на пушчы, на палеткі,
На грыбы, на ягады, на кветкі...
– Калі ласка! – наш зварот бясконцы.
Мы гаворым ранішняму сонцу:
– Калі ласка, сонца, выйдзі з хмары,
Радасцю аблашчы нашы твары,
– Калі ласка! – нашай роднай мовы
Шчырыя і ветлівыя словы.

1. Якія чалавечыя адносіны нараджаюць ветлівыя словы?
2. Якія яшчэ словы падзякі і запрашэння ты ведаеш?



# Велікодная паштоўка





## Табе спатрэбяцца:

папера для асновы;
каляровая папера для яйка;
нажніцы;
аловак, лінейка, клей;
цяжкая кніга.

1. Бяром квадратны аркуш паперы. Адціскаем нажніцамі лінію пасярэдзіне для роўнага згіну. Складаем напалам. Выразаем хвалю па адным краі паштоўкі. Аснова гатовая.

2. Складаем аркуш каляровай паперы, да згіну прыкладаем узор і абрысоўваем алоўкам.

   Выразаем яйка па контуры. Выразаць трэба да канца, не абрываць.

   Выстрыгаем малюнак, згінаючы паперу па чырвоных лініях: пачынаем з маленькага ўзору, пасля выстрыгаем большы ўзор. Трымаем паперу, каб яна не рассоўвалася.

3. Яйка гатовае. Разгортваем яго. Каб яно выраўнялася, кладзём пад цяжкую кнігу.

   Прыклейваем яйка на паштоўку. Яйка цалкам змазваць не трэба, толькі ў тых месцах, дзе найменш выстрыжана.

часопіс «Гарбузік»

# Як прыйшла да нас кніга

## Чытанка на гліняных таблічках

Ты, можа, думаеш, што кнігі былі заўсёды. А між тым быў час, калі ні кніг, ні паперы не было.

На чым толькі не пісалі тады людзі! На лісцях дрэў, на бярозавай кары. Даўней шмат якія надпісы высякалі на камянях, выціскалі на гліняных таблічках. Бралі гліну, размочвалі і палачкаю рабілі на ёй знакі. Уявіце сабе цаглінку таўшчынёю ў два пальцы. Сотні такіх цаглінак і ўтваралі старадаўнюю кнігу.

Цікавая «папера» – ці не праўда? Нават у агні не гарыць.

Але паспрабуй такую кнігу палажыць у ранец. Калі б твая чытанка была напісана на такіх таблічках, дык ты б не падняў яе. Такая цяжкая была б яна. Ды і конь не пацягнуў бы воз з такою чытанкаю. Вунь, бачыш, стаіць аднатонка. Хіба дзесяць такіх машын змаглі б толькі павезці тваю кнігу. Вось і ўяві: ідзеш ты ў школу, а дзесяць машын вязуць за табою тваю чытанку.

Смешна! Нязручная такая кніга.

Таму людзі ўвесь час шукалі, на чым жа было б лепш пісаць.

У далёкай Афрыцы, у нізоўі вялікай ракі Ніл, рос папірус. Расліна, падобная да нашага аеру ці трыснягу. На што толькі не ўжывалі даўней людзі гэту расліну. З яе вілі вяроўкі, плялі кашы, рабілі лодкі. Але галоўнае – яе ўжывалі для пісьма. Разразалі сцябло на палоскі, склейвалі і на іх пісалі. Ад папіруса і пайшла назва нашай паперы.

Але папірус рос далёка. Не заўжды яго прывязеш.

## Кнігі на ланцугу

Пазней пачалі пісаць на скурах маленькіх цялят, ягнят, казлянят. Ачышчалі скуры ад шэрсці і пісалі.

На тоўстую кнігу ішло каля двухсот скурак. Падумай толькі – цэлы статак на адну кнігу! Таму даўней кніга была вельмі дарагая. Нават не ўсякі багаты чалавек мог купіць яе.

Ды і перапісвалі кнігі ад рукі. Каб выразна перапісаць адну кнігу, трэба было затраціць цэлы год.

І не дзіва, што ў даўнія часы кнігі ў бібліятэках былі акаваныя і нават навязаныя на ланцугу.

Іх можна было там пачытаць на стале, але не можна было ўзяць дадому.

## Наш першадрукар

Мінула яшчэ шмат часу, пакуль пачалі ў нас пісаць на паперы. Яе выраблялі з перамолатага старога адзення ці дрэва.

Папера была куды таннейшая за скуры.

А яшчэ пазней дадумаліся людзі не перапісваць, а друкаваць, адбіваць кнігі.

Усе вы, пэўна, бачылі пячатку ці штэмпель. Там выразаны словы ці малюнак. Змазаў такую пячатку ці штэмпель чарнілам ці тушшу і адбівай. Адразу гатовы надпіс ці малюнак.

Так пачалі вырэзваць на дошчачках старонкі і адбіваць іх на паперы. Пасля аркушы з адбітым пісьмом сшывалі, пераплялі, рабілі вокладкі, і выходзіла кніга.

Вырэзваць старонкі было марудна, але затое адбіваць пасля было ўжо лёгка.

Пазней пачалі вырэзваць не старонкі, а толькі літары. І ўжо з літар, як вы ў першым класе з разразной азбукі, набіраць словы, сказы.

Раней дошчачкі-старонкі пасля друку даводзілася выкідаць. Яны ж былі ўжо зусім непатрэбныя. А новыя старонкі трэба было зноў вырэзваць.

А калі пачалі вырэзваць асобна літары, то з тых самых літар можна было набіраць усё новыя і новыя словы, старонкі.

Першым чалавекам, які пачаў друкаваць кнігі на нашых землях, быў беларус Францыск Скарына.

У 1517 годзе ў чэшскай Празе ён пачаў друкаваць на блізкай да нашай народнай мовы вялікую кнігу чалавецтва – Біблію. Кнігу, што вучыць: любі сваіх бацьку і маці, не забі, не крадзі, не сведчы фальшыва... Кнігу, якую ён лічыў найпершым падручнікам у навуцы і жыцці.

Ён вельмі любіў нашу Радзіму, мову. У адной з кніг ён напісаў: «...Звяры, што ходзяць у пустыні, знаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае, – гэтак жа і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормленыя... да таго месца вялікую ласку маюць».

Анатоль Клышка

1. На чым даўней пісалі людзі?
2. Адкуль пайшло слова *папера*?
3. Хто першым пачаў друкаваць кнігі ў нашай краіне?



**Дзеясловы** – словы, якія абазначаюць дзеянне або стан прадмета і адказваюць на пытанні: *што рабіць?, што зрабіць?, што дзеецца з прадметам?*
**Дзеясловы** змяняюцца па часах (**цяперашні час, прошлы час, будучы час**) (*друкуе, друкаваў, надрукуе, будзе друкаваць*).

**1.** Прачытай тэкст. Знайдзі дзеясловы і вызначы іх час.

Ігар асцярожна закінуў вудачку, каб не парушыць спакой ракі. У гэты час якраз узышло сонца. Заззялі ад яго праменняў тысячы расінак на траве, на лісці вярбы, пазалацілася рака.

Прыемна сядзець ціхім летнім ранкам на беразе ракі. Не зварухнецца ніводная травінка, ніводзін лісток. Ледзь чутна булькоча вада, час ад часу ўсплёсне неспакойная рыба. Цешыцца сэрца рыбака. (Уладзімір Шахавец)

**2.** Пастаў дзеясловы ў адпаведнай форме, згоднай з пытаннем.

| | Што робіць? | Што рабіў? | Што рабіла? |
|---|---|---|---|
| рысаваць | ..... | ..... | ..... |
| чытаць | ..... | ..... | ..... |
| пісаць | ..... | ..... | ..... |
| гуляць | ..... | ..... | ..... |
| спяваць | ..... | ..... | ..... |
| насіць | ..... | ..... | ..... |

**3.** Змяні дзеясловы па пытаннях.

| | Што будзе рабіць? | | Што зробіць? |
|---|---|---|---|
| рысаваць | ..... | ..... | ..... |
| чытаць | ..... | ..... | ..... |
| пісаць | ..... | ..... | ..... |
| спяваць | ..... | ..... | ..... |
| насіць | ..... | ..... | ..... |

Леанід Дайнека

# Беражыце сшыткі, кніжкі!

Каб на кнігі мецць паперу,
лесу шмат ідзе, без меры.
– А ці вам, сябры, вядома,
як мы лес ратуем дома?

Непатрэбныя паперы
не выкідваем за дзверы.
І блакнот абы-які
не  парвём мы на шматкі,
бо на фабрыцы ў машыну
ідуць яны замест драўніны.
Сшытак спісаны, шпалеры –
будзе новая папера.





Кніга... Там яшчэ адна –
і не зрэзана сасна.
Са старых газет рулон –
уцалеў ад згубы клён.

Мы – прыроды вартавыя.
Нам заўжды дапамагай –
кніжкі ўсе свае старыя
не выкідвай, а збірай.
Лесу шмат, а ўсё ж не лішкі...
Беражыце сшыткі, кніжкі!



**1.** Да чаго заклікае нас аўтар верша?
**2.** Як яшчэ можна выкарыстаць паперу?
**3.** Што вы робіце са «старой» паперай дома?



Вывучы словы песні

**Лявон Вольскі**

# Сонца нам дапаможа



Над нашай зямлёю – неба.
Пад нашым небам – зямля,
На нашай зямлі трава і вада,
І дрэвы, і промні святла.

Нас гэта зямля нарадзіла
Яе малако мы пілі,
І ўсё, што ў жыцці дае нам сілы,
Ёсць на нашай зямлі.

Прыпеў: **Сонца нам дапаможа,**
**Сонца нам дапаможа,**
**Яно любіць нас.**

Дарэмна канкістадоры
Спяваюць песню вайны,
Заваяваць наша сонца і зоры
Ніколі не змогуць яны.



Нас любіць калматае сонца,
Нас любіць месяц сівы.
І сонца і месяц дадуць нам моцы
Для нашае барацьбы.

Прыпеў: **Сонца нам дапаможа...**

Мінуць у тумане стагоддзі,
І сталь спарахнее ўшчэнт,
А мы тут былі, і мы тут будзем,
Пакуль існуе гэты свет.

Прыпеў: **Сонца нам дапаможа...**

канкістадоры — заваёўнікі

# Тэмы:

1. Дзень нараджэння.
2. Пажаданні.
3. Месяц май.
4. Асоба і лік дзеясловаў.
5. Дыктант.
6. Мы – вучні.
7. Дапамога.
8. Змяненне дзеясловаў.
9. Беларуская міфалогія.
10. Песня «Мама хвалюецца».

# Дзень нараджэння

Прыемна, калі людзі помняць твой дзень нараджэння, віншуюць цябе, жадаюць здароўя, поспехаў.

А ты ці помніш дні нараджэння сваіх родных і блізкіх: маці, бацькі, бабулі, дзядулі, братоў, сясцёр?

Колькі чалавек у сям'і – столькі і дзён нараджэння.

У гэты дзень дорага кожнаму тваё віншаванне. Прыемна будзе, калі ты падрыхтуеш і падарунак – кветкі, якія ты вырасціў, малюнак або рэч, зробленую сваімі рукамі. Непрыгожа прасіць у маці, бацькі, дзядулі, бабулі грошай, каб купіць ім падарунак.

Дзень нараджэння – сямейнае свята. Не трэба абвяшчаць усім і кожнаму, калі ў цябе дзень нараджэння. Блізкія табе людзі і твае сябры помняць, калі ты нарадзіўся.

Васіль Вітка

?

1. Ці ты помніш дні нараджэння тваіх родных?
2. Запішы, калі ты нарадзіўся.
3. Чаго можна жадаць сваім бабулі і дзядулі?
4. Чаго можна жадаць свайму сябру ці сяброўцы?
5. Складзі і запішы свае пажаданні выбранай асобе?



# Воля-кулінарка

У Волі сёння свята: ёй споўнілася дзевяць гадоў. Дзяўчынка чакала гасцей.

Пачастунак сябрам Волька збіралася прыгатаваць сама. Распытала ў бабулі, як спячы пірог, і ўзялася за работу. Яна рашчыніла цеста, усыпала цукру, ванілі, усялякіх спецый з бабульчыных бляшаначак.

– Не забудзь, унучка, соды ўсыпаць, – падказала бабуля.

– А дзе яна, сода?

– Ды вунь, – занятая сваёй справай, кіўнула бабуля на шафу.

Волька спрытна ўзабралася на табурэтку, знайшла ў шафе соду, шчодра сыпанула ў цеста.

Госці завіталі вясёлай гурбай, уручылі падарункі: хто кніжку з малюнкамі, хто каляровыя алоўкі, хто шаўковыя стужкі. Пятрусь з Юркам надумаліся пацягаць імянінніцу за вушы, каб вялікай расла. Ледзьве адкараскалася ад іх Волька, пачала гасцей за стол запрашаць. Кубкі з гарбатай прынесла, пірог падала: частуйцеся, калі ласка!



– Сама пякла, – пахвалілася Волька, разразаючы вострым нажом румяную скарынку пірага.

– Паспытаем, – Пятрусь першы адкусіў пірог. Адкусіў і чамусьці скрывіўся.

Нож выпаў з Вольчыных рук. «Чаму гэта не падабаецца гэтаму Петрусю?» Узяла яна кавалачак пірага ў рот і... таксама зморшчылася. А бабуля, паспытаўшы, з дакорам паківала галавой.

– Колькі ж ты соды ўсыпала?

– Усю, што ў бляшанцы была, – праз слёзы адказала Волька. – Каб пірог быў смачнейшы...

– Эх ты, кулінарка! – пляснула далонямі бабуля. – Хапіла б і дзвюх лыжачак...

Яно, можа, і нядобра смяяцца з імянінніцы, але як тут утрымаешся. І госці смяяліся. А Волечка, здавалася, вось-вось заплача.

– І не такое яшчэ бывае, – суцяшала яе бабуля. – Горш, калі хто ні за што не бярэцца... Я вас, унучкі, сваім пячэннем пачастую...

Хлопчыкі і дзяўчынкі пілі чай з бабульчыным пячэннем, пасмейваліся. Але Волька больш не крыўдзілася на іх.

Іван Аношкін

?

1. Якія падарункі прынеслі сябры Вольцы?
2. Што яна падрыхтавала госцям?
3. Чаму пірог аказаўся нясмачным?
4. Як ацэньваеш паводзіны сяброў Волі?
5. Знайдзі ў тэксце 10 дзеясловаў. Запішы іх у сшытку.
6. Вызначы час дзеясловаў.




Станіслаў Шушкевіч

# Кветкамі сады асыпаў май

Кветкамі сады асыпаў май
І напоўніў іх пчаліным гулам.
Закувай, зязюля, закувай,
Каб зямля вясну сваю адчула.

Вокны насцеж раскрывае дом,
Дрэвы ў рэчку хочуць наглядзецца
І сабраліся на досвітку гуртом,
Каб на сонцы раніцай пагрэцца.

У нізіне бліснула рака
Буйнаю срабрыстаю лускою,
І качыным крыкам асака
Не дае вярбе старой спакою.

Разразае хмызнякі і лес
Стужкай тонкаю далёкая дарога,
Падымае наквець сонны бэз,
Каб сказаць, што кветак будзе многа.







Кветкамі ўпрыгожацца сады
І напоўняцца пчаліным гулам,
Словы ў песні радзяцца тады,
Каб зямля шчаслівая іх чула.



?

1. Які настрой у вершы?
2. Да чаго заахвочвае цябе гэты верш?
3. Як разумееш выразы: «вокны насцеж раскрывае дом», «дрэвы ў рэчку хочуць наглядзецца», «качыным крыкам асака не дае вярбе старой спакою»?
4. Колькі строф у вершы?
5. Прачытай усе пары слоў з верша, якія рыфмуюцца.



**Мар'ян Дукса**

# Ці так чытала?



Так чытала,
так гартала,
аж пакуль цямнець не стала.
З кніжкай ела,
з кніжкай спала,
з кніжкай бегала нямала.
З ёй у сад хадзіла я,
з ёй была ля ручая,
з ёй сядзела рана-рана
ля блакітнага экрана.
Нават
кнігі не закрыла.
Так вучыла,
так гартала –
толькі тройку атрымала.
Можа,
я не так чытала?







1. Што дзяўчынка рабіла не так?
2. Знайдзі і запішы словы, якія ўказваюць на дзеянні дзяўчынкі.





*Прыйдзеш дадому ўвесь мокры ...*

# Дыктант

Алесь дрэнна піша дыктанты. Памылка перад памылкай скача. Каб хлопчык трохі падцягнуўся, настаўніца параіла часцей пісаць дыктанты дома.

Вечарам Алесь прынёс тату падручнік і сказаў:

– Дыктуй, тата. Буду вучыцца пісаць без памылак.

Тата ахвотна дыктуе, Алесь старанна піша. І так некалькі дзён запар. А потым тата адклаў падручнік убок.

– Садзіся, сынок, пішы, – сказаў ён. – Сёння буду дыктаваць на памяць.

Алесь выводзіць сказ за сказам: «На дварэ адліга. Радасна свеціць сонейка. На вуліцы – лужыны. Я не магу прайсці міма, абавязкова ўлезу ў ваду...» – Алесь глянуў на тату:

– Ты пра каго гэта так?

– Пішы, сынок, пішы...

Алесь працягвае пісаць: «Прыйдзеш дадому ўвесь мокры – вось маці і работа. А яна хацела адпачыць...»

– Дрэнны дыктант ты, тата, прыдумаў, – пачырванеў да вушэй Алесь.

Гэта не я прыдумаў, а ты сынок, – кажа тата і дыктуе далей.

Вечарам, зрабіўшы ўрокі, Алесь гадае, які дыктант ён будзе пісаць заўтра. У добрым дыктанце заўсёды менш памылак.

Віктар Ткачоў

?

1. Чаму Алесь назваў дыктант дрэнным?
2. Чаму тата сказаў, што дыктант прыдумаў Алесь?
3. Як адчуваў сябе Алесь у час пісання дыктанта?

# Білеты ў цырк

У горад прыехаў цырк. Маці дала Кастусю грошы і сказала:

– Сёння ў 12 гадзін пойдзем у цырк. Купі два білеты. Адзін мне, другі – сабе. Потым строга дадала:

– Глядзі ж, не баўся.

Праз якія паўгадзіны радасны Кастусь ужо імчаўся дадому, сціскаючы ў руцэ дзве сіненькія паперкі.

Усюды ў горадзе віселі цыркавыя афішы. Каля адной з афіш Кастусь спыніўся. На ёй быў цікавы малюнак: белыя сабачкі стаялі ў рад і пярэднімі лапкамі віталі мядзведзя. Як многа цікавага ўбачыць Кастусь сёння ў цырку!

Нейкі дзядзька, праходзячы міма, штурхануў хлопчыка ў плячо.

– Не бачыце, ці што? – сярдзіта сказаў Кастусь.

Дзядзька спыніўся, павярнуўся назад. На вачах у яго былі акуляры з сінімі шкельцамі, у руках ён трымаў жалезную кульбу.

– Прабач, хлопчык, – ціха прамовіў ён. Памацаўшы кульбай вакол сябе, дзядзька асцярожна зрабіў некалькі крокаў.



«Сляпы», – здагадаўся Кастусь. Сляпы ішоў проста ў лужу.

– Дзядзька, вада там! – крыкнуў Кастусь.

Сляпы збочыў управа і наткнуўся на паркан.

– Паркан! – зноў крыкнуў хлопчык. Ён падбег да сляпога, узяў яго за руку, вывеў на дарогу і спытаў:

– Вам далёка ісці?

– На вакзал.

– О! – здзівіўся хлопчык. – Як жа вы дойдзеце?

– Як-небудзь.

Не выпускаючы рукі сляпога, Кастусь вёў яго спачатку па тратуары, потым па скверы. А калі дайшоў да плошчы, Кастусь спыніўся. Тут яму трэба было зварочваць дадому, а дарога на вакзал ішла налева.

– Я, дзядзька, сёння ў цырк пайду, – сказаў Кастусь, – мяне мама чакае. Бывайце.

– Бывай. Дзякуй табе.

Кастусь пабег. Ужо ля самога дома ён азірнуўся і ўбачыў, што сляпы стаіць на тратуары і ніяк не асмельваецца перайсці плошчу. Машыны ішлі ды ішлі бясконцым патокам. Грузавыя і легкавыя, тралейбусы і аўтобусы. А сляпы ўсё стаяў і нецярпліва пастукваў кульбай. «Ён адзін не пяройдзе, – падумаў Кастусь, – трэба дапамагчы».

Кастусь падбег да сляпога і зноў узяў яго за руку.

Сляпы пазнаў хлопчыка, моўчкі кіўнуў галавой і пакрочыў следам за ім.

Васіль Хомчанка

?

1. Куды пайшоў Кастусь?
2. Каго спаткаў хлопец?
3. Як Кастусь яму дапамог?
4. Чаму вучыць гэтае апавяданне?
5. Чаму трэба дапамагаць адзін аднаму?
6. Ці здарылася табе дапамагчы каму-небудзь?
7. Як ты сябе адчуваў, дапамагаючы іншым?
8. Зрабі плакат-афішу з заклікам дапамагаць адзін аднаму.

## Дзеясловы ў цяперашнім часе змяняюцца па асобах і ліках.

| адзіночны лік | | множны лік | |
|---|---|---|---|
| **1-ая асоба** | я чытаю | **1-ая асоба** | мы чытаем |
| **2-ая асоба** | ты чытаеш | **2-ая асоба** | вы чытаеце |
| **3-ая асоба** | ён, яна, яно чытае | **3-ая асоба** | яны чытаюць |

| адзіночны лік | | множны лік | |
|---|---|---|---|
| **1-ая асоба** | я бачу | **1-ая асоба** | мы бачым |
| **2-ая асоба** | ты бачыш | **2-ая асоба** | вы бачыце |
| **3-ая асоба** | ён, яна, яно бачыць | **3-ая асоба** | яны бачаць |

**1.** Запішы дзеясловы ў 1-ай асобе адзіночнага і множнага ліку:

**гаварыць, стаяць, гуляць, пісаць, спяваць, маляваць.**

**2.** Запішы дзеясловы ў 2-ой асобе адзіночнага і множнага ліку:

**хадзіць, ехаць, бачыць, ісці, глядзець, чытаць.**

**3.** Запішы дзеясловы ў 3-ай асобе адзіночнага і множнага ліку:

**хадзіць, рабіць, хварэць, збіраць, працаваць, казаць.**

# Хто ты ў беларускай міфалогіі

**Адкажы на ўсе пытанні. Палічы, якіх адказаў у цябе найбольш.**

**1.** У тваім пакоі абавязкова ёсць:

- ◆ **турнік**
- 💧 **кніжная шафа**
- ● **шмат раслін**
- ✹ **бездакорны парадак**
- ■ **люстэрка ў прыгожай рамцы**

**2.** Чым ты любіш займацца?

- ◆ **спаборнічаць**
- 💧 **апавядаць цікавыя гісторыі**
- ● **бавіцца на прыродзе**
- ✹ **рабіць што-небудзь карыснае**
- ■ **апранацца ў прыгожыя строі**

**3.** Ты выбіраеш гурток:

- ◆ **рыцарскі**
- 💧 **літаратурны**
- ● **экалагічны**
- ✹ **майстравання**
- ■ **тэатральны**

**4.** Якіх урокаў ты чакаеш найбольш? Можаш абраць некалькі варыянтаў:

- ◆ **фізкультура**
- 💧 **гісторыя**
- ● **прырода**
- ✹ **тэхніка**

- маляванне
- рэлігія
- беларуская мова
- матэматыка
- музыка

**5.** Ты збіраеш:

- медалі і ўзнагароды
- закладкі, маркі
- гербарый
- гузікі ці манеты
- упрыгожанні

**6.** Найлепшыя вакацыі – гэта:

- летнік
- падарожжа ў новую краіну
- паход у лес ці на рэчку
- адпачынак у знаёмым месцы: дома ці ў бабулі
- выступы на сцэне перад захопленымі гледачамі



## Большасць адказаў

**Асілак** у беларускіх казках – дужы і смелы герой, змагар са злым Цмокам. У цябе з Асілкам шмат агульнага! Твае найлепшыя якасці – адвага ды імкненне да перамогі. Ты не дасі ў крыўду сяброў і дапаможаш слабейшаму. Напэўна, ты ўжо наведваеш спартовую секцыю ці рыцарскі гурток (а калі не – абавязкова паспрабуй). Турніры і спаборніцтвы – годны занятак для сапраўдных беларускіх асілкаў.

## Большасць адказаў

**Казачнік Бай** у беларускім фальклоры – персанаж, якога дужа любяць дзеці. Сябрам вельмі цікава з табою, бо ты чалавек з багатай фантазіяй і ўяўленнем, разумны і начытаны. Скласці казку, намаляваць чароўную мапу, прыдумаць незвычайную гульню – заняткі, якія па-сапраўднаму цябе захапляюць. Магчыма, у тваім пакоі не надта прыбрана (а калі шчыра – часам суцэльны вэрхал), але самыя незвычайныя рэчы месяцца якраз тут!

## Большасць адказаў

**Лесавік** у беларускім фальклоры адказвае за парадак у лесе. Відавочна, ты таксама любіш прыроду. Твае моцныя якасці: дабрыня, спагада, увага да цікавых дэталяў. Найлепшы адпачынак для цябе – паход з намётам. Здольнасць заўважаць незвычайнае ў прыродзе дапаможа табе стаць цудоўным фатографам ці мастаком, выдатным біёлагам ці геолагам. А можа, ты любіш дапамагаць жывёлам і марыш стаць ветэрынарам? Выбар за табою!

## Большасць адказаў

**Дамавік** – руплівая і практычная істота. Любіць сваю хатку і дапамагае сям'і. Стараецца паспрыяць гаспадарам у хатніх клопатах. Магчыма, ты выдатна гатуеш, або майструеш прыгожыя рэчы, ці сочыш за парадкам у хаце. Ты можаш стаць шэф-кухарам першакласнай рэстарацыі, дызайнерам утульных інтэр'ераў, універсальным майстрам на ўсялякія штукі і нават – дырэктарам школы сапраўдных дамавікоў!

## Большасць адказаў

**Жар-птушка** ў беларускіх казках – увасабленне незвычайнасці і харaства. Для цябе важна, як ты выглядаеш. Ты любіш, каб твой вобраз быў прыгожым ды адметным і, напэўна, старанна падбіраеш і даглядаеш свой гардэроб. Сябры захапляюцца тваім уменнем паказаць сябе. Тым, хто атрымаў больш значкоў, варта выпрабаваць свае сілы ў тэатральным гуртку, з іх выходзяць таленавітыя артысты.

з часопіса «Гарбузік»



Вывучы словы песні

**Андрэй Хадановіч**

# Мама хвалюецца



Мама хвалюецца – раз:
Нехта залез пад матрац.
Мама хвалюецца – два:
Выцягні бот з рукава!
    Мама хвалюецца – тры:
    Цацкі ў пакоі збяры!
    І не раскідвай гарох!
    Мама ўжо лічыць да трох.
Гэтыя чорныя дзіры
Зноў на каленках... Чатыры!
Мама хвалюецца – пяць:
Спі! Нават бэйбусы спяць!
    Зранку – хто кашы не есць?!
    Зранку – хто кашы не есць?!
    Зранку – хто кашы не есць?!
    Мама хвалюецца – жэсць!





# Тэмы:

1. Нашы рукі.
2. Акіян.
3. Рыбакі.
4. Просты сказ. Дзейнік і выказнік.
5. Ягады.
6. Вясёлка.
7. Колеры.
8. Клімат.
9. Песня «Простыя словы».
10. Як запомніць лета? Канікулы!

Гэля Савіцкая

# Правая ды левая

У мяне ёсць дзве рукі,
Толькі дзе – якая?
Дзе тут правая рука?
Зараз адгадаю!



Праваю рукой пішу,
Валасы ёй прычашу,
І трымаю лыжку,
І гартаю кніжку.
І вітаюся з табой
Зранку праваю рукой.

Ну а левая рука
Для чаго мне трэба?
За сталом трымаю ў ёй
Я кавалак хлеба.



Мне без левае рукі
Ў дошку не забіць цвікі,
Ані кубак не памыць,
Ані гузік не прышыць.

Там, дзе правая рука
Справу пачынае,
Там і левая рука
Ёй дапамагае.

?

1. Якая рука пераважае ў цябе?
2. Прачытай верш. Замест слова «правы» чытай «левы», замест слова «левы» чытай «правы».
3. Што ты робіш правай рукой?
4. У чым дапамагае табе левая рука?

**Калі сабраць разам сто чалавек, сярод іх будзе каля пятнаццаці тых, хто карыстаецца левай рукой лаўчэй, чым правай.**

## Існуе Міжнародны дзень ляўшукоў –

## 13 жніўня.



## Акіян

Зямлю называюць «Блакітнай планетай». Большую частку яе паверхні займае вада – чатыры акіяны: Ціхі, Атлантычны, Індыйскі, Паўночны Ледавіты. Дзякуючы ім, з космасу Зямля сапраўды здаецца блакітнай.

Слова акіян паходзіць з грэчаскай мовы і азначае «бязмежнае мора, вялікая рака, якая абцякае Зямлю». Гэта таямнічы свет з незвычайнымі раслінамі, малюскамі, рыбамі. Акіян поўны разнастайных жывёл – ад мікраскапічнага планктону да вялізных кітоў.

## Як вывучаюць акіян?

Даследаваннем акіянічных глыбінь займаюцца акіянолагі. Гэта захапляльная, але вельмі рэдкая прафесія. (Спытай у дарослых: ці шмат акіянолагаў ведаюць яны асабіста). Акіянолагі сочаць за чысцінёй вады і дна, назіраюць за жыццём рыб і падводных жывёл.



Акіян вывучаюць падчас навуковых экспедыцый на даследчых суднах. Там ёсць прылады для лоўлі глыбакаводных жывёл, для вымярэння тэмпературы вады і хуткасці плыняў. У акіянічныя глыбіні спускаюцца вадалазы. Да глыбіні 50 метраў яны апранаюць звычайныя вадалазныя касцюмы. На спіну чалавека чапляюцца газавыя балоны, ад якіх праз шланг падаецца паветра. Калі трэба спусціцца яшчэ ніжэй, апранаюць цвёрдыя ахоўныя скафандры. Рэч у тым, што на вялікай глыбіні ціск вады нашмат большы. Без ахоўнага касцюма чалавека проста расцісне нібы праснак!

Цяпер акіянолагам дапамагаюць касмічныя спадарожнікі Зямлі. Яны могуць абляцець планету некалькі разоў за суткі альбо нерухома «завіснуць» над адным месцам. З касмічнай вышыні можна вызначыць тэмпературу вады, вышыню хваль, убачыць акіянічныя плыні, а таксама забруджанні.

## Чаму акіян салёны

Амаль уся вада на нашай планеце салёная, яе нельга піць. Прэснай, пітной вады мала, і ў многіх засушлівых краінах здабыць яе – вялікая праблема.

У вадзе мораў і акіянаў шмат солі – той самай, з якою мы гатуем ежу. Яна трапляе туды з сушы. Рэкі і ручаі вымываюць часцінкі солі з глебы і нясуць у мора. Потым вада з паверхні мора выпараецца, а соль – тая самая, прынесеная рэчкамі з зямлі – застаецца. Кропелькі вады над акіянам збіраюцца ў хмары і падаюць дажджом на зямлю. А там ізноў забіраюць з глебы часцінкі солі, трапляюць у раку і бягуць у мора... Вось так і адбываецца колаварот вады ў прыродзе, вось таму акіян салёны.

У акіяне жыве сіні кіт – найвялікшая жывёла планеты. Яго даўжыня дасягае 33 метраў.

Каля берагоў трапічных водаў шмат каралавых рыфаў – месцаў жыхарства вялікай колькасці водарасцей, рыб, малюскаў, губак ды іншых марскіх арганізмаў. Іх нават называюць радзільняй акіяна. А каралавыя паліпы, з якіх складаюцца рыфы, чысцяць ваду, падтрымліваюць экалагічную раўнавагу ў акіяне.

## Горы... на дне акіяна

Калі ты на беразе мора, то памятаеш, як жоўты пясочак пляжа ў вадзе пераходзіць у мяккае марское дно. Здаецца, нібы ўсё дно мора роўнае і пясчанае. Але насамрэч там ёсць і горы, і раўніны, і бездані... І нават вулканы! З самай глыбіні Зямлі праз шчыліны вывяргаецца гарачая лава і застывае. Наступнае вывяржэнне вулкана паступова павялічвае гару застылай лавы. Калі макаўка падводнага вулкана выступае з вады, утвараецца выспа. Вулканічныя выспы ёсць ва ўсіх акіянах, апроч Паўночнага Ледавітага.

Самая вялікая вулканічная выспа ў свеце – Ісландыя.

Самае глыбокае месца ў свеце – Марыянская западзіна, вялізная трэшчына ў дне Ціхага акіяна. Яе глыбіня 11 кіламетраў.

Гражына Арсайла

?

1. Якая інфармацыя цябе зацікавіла?
2. Пра што ты раней не ведаў / ведала?
3. Чым займаюцца акіянолагі?



Кастусь Цвірка

# Рыбакі

На зары не спі, дарога!
Да задымленай ракі
Крочаць плоймай басаногай
Рыбакі.

Трапятаць у вёдрах будуць
Плоткі, карпы, шчупакі...
Разматалі дружна вуды
Рыбакі.

Бераг.
Сонца – вышай, вышай
Ды... не тонуць паплаўкі.
І сядзяць у чуйнай цішы
Рыбакі.

Вечарком нясуць дадому
Вуды доўгія і стому
Ды пустыя кацялкі
Рыбакі.

А назаўтра – ледзьве золак –
Да засмужанай ракі
Зноў бягуць гурмой вясёлай
Рыбакі.







1. Вызначы агульны настрой верша.
2. Знайдзі радкі, якія перадаюць мары хлопцаў пра багаты ўлоў.
3. Чым закончылася рыбная лоўля?
4. Што больш падабаецца хлопцам: улоў ці адпачынак ля ракі? Абгрунтуй свой адказ на аснове тэксту.



**Дзейнік** і **выказнік** – галоўныя члены сказа.
**Дзейнік** абазначае пра каго ці пра
што гаворыцца ў сказе.
Адказвае на пытанні хто? што?
**Выказнік** абазначае то,
што гаворыцца пра **дзейнік**.

Вучні пісалі дыктант.
Хто? вучні – дзейнік
Што рабілі вучні? пісалі – выказнік

**1.** Дапоўні сказы дзейнікамі.

..... ідуць дадому.
За акном спяваюць ..... .
..... гуляюць у мяч.
Прыпякае ..... .
..... правярае сшыткі вычняў.
Побач школы растуць ..... .

**2.** Дапоўні сказы выказнікамі.

Воля ..... кніжку.
Вераб'і ..... за акном.
Бабуля ..... у краму.
Мама ..... на панадворку.
За домам ..... лес.
Вучні ..... у кіно.
Ён ..... у парку.
Дзеці ..... у лесе.
Кіты ...... у акіяне.

**Пятро Глебка**

# Ягады



Які сяголета шчаслівы
І ураджайны выпаў год:
Ва ўсіх садох агрэст і слівы,
Суніцаў повен агарод.

Пустыр закінуты калішні –
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.

А за аселіцай, над рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набракла дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.

А што за ягады лясныя
У нас адразу зацвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разнеслі па зямлі.

Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясох,
За імі следам і чарніцы
Закрасавалі ў верасох.

Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завяззю брусніц.

І ўсе балотныя палянкі
Цвітуць агнямі журавін,
І неўзабаве ўспыхнуць гранкі
Чырвоных, яркіх арабін.

Які сяголета шчаслівы
І незвычайны выпаў год,
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод!



1. Якія ягады растуць у агародзе, садзе і ў лесе?
2. Ці ты любіш есці ягады?
3. Падбяры і запішы адпаведныя прыметнікі.

парэчка (якая?) ...................
арабіна (якая?) ......................
суніцы (якія?) ........................
маліны (якія?) .....................



Рыгор Барадулін

# Як вясёлку ткалі

Калі
Па веснавой зямлі
Прайшоўся дожджык босы,
Вясёлку ткаць
Распачалі
Вясёлыя нябёсы.

– Чакайце! –
Гром не мог маўчаць –
Аж задрыжэла неба. –
З якога колеру
Пачаць
Нам ткаць
Вясёлку трэба?
Чырвоны колер –
Ад зары,
З яго мы і пачнем,
Сябры!

— Аранжавы
За ім ідзе, —
Аблокі нагадалі, —
З гарачым колерам
Нідзе
Не замярзалі далі.
— Аранжавы, аранжавы, —
Скрыпеў вятрак
Абражана.



— Жадаю спеласці такой,
Як жытні поўны колас, —
Сказала сонца.
За ракой
Падтакнуў нейчы голас.
Жаўна,
Падтакнула яна:
— Жаўцее гожа збажына!

Заладзілі сваё
Вятры,
Бягуць,
Як коні з пуні:
— Найлепшы,
Як там ні хітры,
Зялёны колер
Руні.
Зямля зялёная вясной,
Як вецер
Стараны лясной.

— Без вобліку майго
Зусім
Я неба не ўяўляю, —
Блакіт сказаў, —
Любіць усім
Блакітны вам параю.
Бо рэчка пад ракітамі
Блакітная-блакітная.

Сінічка,
Лёгка летучы,
Прысела на галіне,
Спытала:
— Бачылі ўначы



Туман пяшчотна-сіні?
Вядома, ўсё без сіняга,
Як бераг той
Без сітняга!

— Фіць-фіць, —
Спяшае ластаўка,
Што пад страхою
Летуе, —
Калі ўжо ткаць
Палас такі,
Дык колер фіялетавы
Патрэбен тут выключна,
Ён з сінім неразлучны.

І цацярук
Хвале дае
Той колер фіялетавы.
І выткалі вясёлку,
Вясёлку-весялуху,
І, зззяючы пасёлку,
Яна ўзышла з-за лугу.

Сем колераў
Гарыць у ёй,
Пералічы
І ўсе засвой!



Чырвоны,
Аранжавы,
Жоўты,
Зялёны,
Блакітны,
Сіні,
Фіялетавы.

Іх помняць
Лясы і адхоны,
Вясёлыя колеры гэтыя!

Сем колераў,
Як сем прыгод.
Вясёлка
Тчэцца з іх
Штогод!



1. Калі ўзнікае вясёлка?
2. Назаві ўсе колеры вясёлкі.
3. Які твой любімы колер?

Сонечныя промні падаюцца табе светлымі, але насамрэч яны збіраюцца з розных колераў: чырвонага, аранжавага, жоўтага, зялёнага, блакітнага, сіняга і фіялетавага. Калі промні праходзяць скрозь кроплі дажджу, на небе з'яўляецца вясёлка.

Кроплі дажджу працуюць нібы прызмы. Яны раскладаюць святло на колеры, прапускаюць яго пад розным ухілам ды ўтвараюць каляровую паласу – спектр. Вясёлка – гэта і ёсць велізарны выгнуты спектр. Але для яе з'яўлення павінны выконвацца тры ўмовы: каб ішоў дождж; каб свяціла, але невысока, сонца; каб глядач быў паміж дажджом і сонцам.

# Што ты можаш зрабіць для захавання клімату?

- Выбірай тэхніку з нізкім узроўнем спажывання энергіі.
- Дзе магчыма, карыстайся роварам замест транспарту.
- Адключай ад сеткі камп'ютар, калі сыходзіш.
- Выкарыстоўвай лямпы, якія ашчаджаюць энергію.
- Набывай прадукты мясцовай вытворчасці.
- Сартуй смецце.
- Зачыняй дзверы і вокны, калі працуе абагрывальнік або кандыцыянер.
- Больш хадзі пехатою або карыстайся публічным транспартам.

**1.** Што яшчэ можна зрабіць, каб дапамагчы нашай планеце?
**2.** Падрыхтуй плакат-афішу да аднаго з пунктаў прыведзеных вышэй.



Міхал Анемпадыстаў

# Простыя словы

Простыя словы, простыя рэчы:
Хлеб на стале, полымя ў печы.
Гэта так проста, гэта так добра,
Як з галавою залезці пад коўдру.

Простыя словы,
Простыя рэчы,
Простыя словы,
Простыя рэчы.

Прыцемкам сінім зімовай парою
Ў доме бацькоўскім усё так знаёма.
Ёсць чым сагрэцца, ёсць дзе схавацца
Ў доме бацькоўскім, у матчынай хаце.

Простыя словы,
Простыя рэчы,
Простыя словы,
Простыя рэчы.

Ўсё так надзейна, усё так грунтоўна,
Што тут дадаць – хіба, что нічога.
Можна жыць далей, дзень прыйдзе новы.
Дабранач, паненкі! Дабранач панове!

Простыя словы,
Простыя рэчы,
Простыя словы,
Простыя рэчы.







# Тузін спосабаў запомніць лета

1. Зрабіць і запусціць цмока-лятаўца.
2. Пабегаць басанож па траве.
3. Павеславаць альбо паставіць ветразь на чоўне.
4. Даехаць роварам да возера, поля, узлеску.
5. Сарваць з грады свежы агурок.
6. Пашукаць купальскую папараць-кветку.
7. Схаваць скарб і намаляваць сябрам мапу.
8. Прачытаць цікавую кніжку.
9. Напісаць ліст сябру з аповедам пра свае прыгоды.
10. Скласці заплечнік для вандроўкі з начлегам.
11. Знайсці белы грыб ды высушыць, каб узімку быў смачны суп.
12. Дастаць з дна рэчкі, возера ці мора каляровы каменьчык.



**Віктар Швед**

# Канікулы



Канікулы, канікулы,
Вясёлы летні час.
Прырода зноў паклікала
У лес і ў поле нас.

Краіны нашай вольнае
Нязведаны прастор
Заве ўсю моладзь школьную
Да мораў і да гор,

Да роўнядзі азёрнае,
Да цішыні бароў,
Пад неба ночы зорнае,
Да цеплыні кастроў...



Вясёлымі, здаровымі,
Сіл маючы запас,
Да працы зноў гатовымі
Мы ў школьны прыйдзем клас.

?

1. Чым можна займацца на канікулах?
2. Куды можна паехаць на вакацыі?
3. Раскажы, якія твае планы на канікулы?



# ЗМЕСТ

**Тэмы** ........ 5
**За навуку,** Якуб Колас ........ 6
**Прывітанні, развітанні** Алеся Літвіноўская, Глеб Лабадзенка ........ 7
**Люда і людажэр,** з часопіса «Гарбузік» ........ 8
**Літары, гукі** ........ 9
**Дарога ў школу** ........ 10
**Клапатлівыя машыны,** Алена Церашкова ........ 11
**Пра абавязкі,** Васіль Жуковіч ........ 13
**Алфавіт** ........ 14
**Выбары старасты,** Мар'ян Дукса ........ 15
**Правапіс вялікай літары** ........ 16
**Верасень,** Віктар Шалкевіч ........ 17

**Тэмы** ........ 18
**Надвор'е,** Алеся Літвіноўская, Глеб Лабадзенка ........ 19
**Як людзі навучыліся есці бульбу,** Валянціна Пашкевіч ........ 20
**Рэцэпт на яблычны ўзвар** ........ 21
**Аканне** ........ 22
**Няма дома нашай мамы,** Ларыса Геніюш ........ 23
**Наша меню** ........ 24
**Смачна есці** ........ 25
**Род назоўнікаў** ........ 26
**Распарадак дня** ........ 27
**Смачны сон,** Васіль Зуёнак ........ 29
**Дзеяслоў** ........ 30
**Інтэрнэт,** Рыгор Барадулін ........ 31
**Тры чарапахі,** Лявон Вольскі ........ 33

**Тэмы** ........ 34
**Давайце пасадзім па дрэўцу,** Хведар Гурыновіч ........ 35
**Пасадзіце рабінку,** Рыгор Ігнаценка ........ 37
**Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя** ........ 39
**Буслы,** Клаўдзія Каліна ........ 40
**Правапіс „ў" (нескладовага)** ........ 42

**Птушкі ў беларускіх прыказках і прымаўках** ........ 43
**Загадкі пра птушак** ........ 44
**Свойская жывёла** ........ 45
**Зубры ў Белавежскай пушчы,** Валянціна Пашкевіч ........ 46
**Зубры,** Ларыса Геніюш ........ 47
**Жыў-быў вожык,** Янка Брыль ........ 49
**На паляванні,** Леанід Шырын ........ 51
**Шануйце ўсё жывое,** Уладзімір Дубоўка ........ 52
**Лось з Ласінкі,** Міра Лукша ........ 53

**Тэмы** ........ 54
**Радаслоўнае дрэва** ........ 55
**Сям'я. Сваякі,** Алеся Літвіноўская, Глеб Лабадзенка ........ 56
**Мой дом,** Васіль Сумараў ........ 57
**Апостраф** ........ 58
**Прафесіі,** Васіль Вітка ........ 59
**Сямейны аркестрык,** Васіль Жуковіч ........ 61
**Якога колеру снег,** Віталія Глаз ........ 63
**Белая сняжынка,** Міхась Андрасюк ........ 65
**Лік назоўнікаў** ........ 66
**Валёначак святога Мікалая,** Уладзімір Някляеў ........ 67

**Тэмы** ........ 68
**Год і яго род,** Ларыса Геніюш ........ 69
**Дата,** Алеся Літвіноўская, Глеб Лабадзенка ........ 71
**На Каляды,** Уладзімір Някляеў ........ 72
**Казка пра крылы,** Ганна Сілівончык ........ 73
**Скланенне назоўнікаў** ........ 74
**Панна Марыя** ........ 76
**Чарадзейныя фарбы,** Яўгеній Пярмяк ........ 77
**Жыў на свеце дзядзька тыдзень,** Мікола Чарняўскі ........ 80
**Лыжы,** Клаўдзія Каліна ........ 82
**Зіма,** Паўлюк Трус ........ 85
**Словы на снезе,** Юлій Ванаг ........ 87
**Яканне** ........ 88

**Тэмы** ........ 89
**Снег не ідзе,** Андрэй Хадановіч ........ 90

**Люты,** Міра Лукша ........ 91
**Аглушэнне звонкіх зычных** ........ 92
**Для цікавых,** Буслянка 4 ........ 93
**Выходзім у адкрыты космас,** Гражына Арсайла ........ 94
**На касмічным караблі,** Пятро Клімук ........ 96
**Чаму месяц без вопраткі ходзіць?,** Анатоль Клышка Сінонімы ........ 98
**Вопратка і абутак** ........ 99
**Азванчэнне зычных** ........ 101

**Тэмы** ........ 102
**Шануй сваю мову,** Януш Корчак ........ 103
**Родная мова,** Артур Вольскі ........ 104
**Адукацыя** ........ 105
**Мой народ,** Алесь Ставер ........ 106
**Родная зямля,** Рыгор Ігнаценка ........ 108
**Род і лік прыметнікаў** ........ 109
**Мая маленькая айчына,** Віктар Швед ........ 110
**Я – беларус,** Сяргей Законнікаў ........ 111
**Усяслаў Чарадзей,** Васіль Жуковіч ........ 112
**Антонімы** ........ 113
**Песенька патрыятычнага Бусла,** Леанід Дранько-Майсюк ........ 114

**Тэмы** ........ 115
**Зіма-падманшчыца,** Азіза Ахмедава ........ 116
**Калі пачынаецца вясна** ........ 118
**Вясна,** Змітрок Бядуля ........ 119
**Спрэчка звяроў,** Кастусь Цвірка ........ 121
**Скланенне прыметнікаў** ........ 123
**Калі ласка!,** Пятрусь Броўка ........ 125
**Велікодная паштоўка,** часопіс «Гарбузік» ........ 126
**Як прыйшла да нас кніга,** Анатоль Клышка ........ 127
**Час дзеясловаў** ........ 130
**Беражыце сшыткі, кніжкі!,** Леанід Дайнека ........ 131
**Сонца нам дапаможа,** Лявон Вольскі ........ 133

**Тэмы** ........ 134
**Дзень нараджэння,** Васіль Вітка ........ 135
**Воля-кулінарка,** Іван Аношкін ........ 136

**Кветкамі сады асыпаў май,** Станіслаў Шушкевіч ........................... 138
**Ці так чытала?,** Мар'ян Дукса ........................................................ 140
**Дыктант,** Віктар Ткачоў ................................................................. 141
**Білеты ў цырк,** Васіль Хомчанка ...................................................... 142
**Асоба і лік дзеясловаў** ................................................................. 144
**Хто ты ў беларускай міфалогіі,** часопіс «Гарбузік» .......................... 145
**Мама хвалюецца,** Андрэй Хадановіч ............................................... 149

**Тэмы** ......................................................................................... 150
**Правая ды левая,** Гэля Савіцкая ...................................................... 151
**Акіян,** Гражына Арсайла ................................................................. 153
**Рыбакі,** Кастусь Цвірка ................................................................... 156
**Дзейнік і выказнік** ....................................................................... 158
**Ягады,** Пятро Глебка ..................................................................... 159
**Як вясёлку ткалі,** Рыгор Барадулін .................................................. 161
**Што ты можаш зрабіць для захавання клімату?** .............................. 165
**Простыя словы,** Міхал Анемпадыстаў ................................................ 166
**Тузін спосабаў запомніць лета** ....................................................... 167
**Канікулы,** Віктар Швед .................................................................... 168